У Мілейчычах ☞ 3



Ніва

ТЫДНЁВІК БЕЛАРУСАЎ У ПОЛЬШЧЫ

АСТАП САПЕГА ☞ 8

http://niva.iig.pl

redakcja@niva.iig.pl

№ 34 (2519) Год XLIX | Беласток, 22 жніўня 2004 г. | Цана 2,00 зл.

Асноўная велічыня сельскагаспадарчай структурнай пенсіі, гэта 210% мінімальнай пенсіі (цяпер 550 злотаў); верхні ліміт — 440%. Найчасцей трэба спадзявацца пенсіі ў 300-працэнтным памеры...

Фота АЛЯКСАНДРА ВЯРБІЦКАГА

Анатоль Галэмбеўскі каля малочнага рэзервуара

Вецер з захаду

Спадар Анатоль Галэмбеўскі, якому цяпер пяцьдзесят дзевяць, ад трыццаці трох гадоў жыве ў Катлах, што ў Бельскай гміне. Раней ягоная сям'я жыла на хутары ў Галёнках, што каля Пухалаў-Старых у Браньскай гміне. Але з Галёнак, куды ні глянуць, усюды далёка, складаны быў даезд у горад. Таму бацька рашыў прадаць тамашнія дванаццаць гектараў і перасяліцца бліжэй Бельска. Купілі гаспадарку ў Катлах і бацька адразу запісаў яе на спадара Анатоля.

— Калі ў Польшчы стаў мяняцца гаспадарчы строй, — кажа Анатоль Галэмбеўскі, — я рашыў інвеставаць у гаспадарку, перабудаваць яе на сучасны лад. Я верыў, што змены ідуць у напрамку Еўрасаюза, што і ў нас настане такая ж, як і там, спрыяльная земляробам аграрная палітыка. Пра гэта я гаварыў суседзям, а яны падсмейваліся, што гэта няпраўда. А я ім гаварыў „Пажывяце, пабачыце". У 1993 годзе я пераключыўся толькі на гаспадаранне; сёння ў нас звыш семнаццаці гектараў уласнай зямлі і каля трынаццаці арандаванай. І амаль усе гэтыя гектары працуюць на вытворчасць малака, бо ўжо з 1987 года сталі мы развіваць статак кароў. У 1998 годзе паставілі ў сябе малочны рэзервуар.

Наша гаспадарка, лічу, перспектыўная, але ў маім узросце перспектывы згортваюцца. І банкі такім людзям абмяжоўваюць крэдыты. Пра будучыню я стаў гаварыць з наймалодшым сынам. Яму і хочацца, і колецца, але згадзіўся ўзяць ад нас гаспадарку, бо мяркуе, што на ёй, калі цэны нашых прадуктаў будуць набліжацца да еўрасаюзных маштабаў, можна будзе зарабляць прынамсі ўдвая больш, чым на гарадской пасадзе.

Пра сельскагаспадарчую пенсію мы думалі ўжо даўней і цяпер мы рады скарыстацца прадастаўленымі нам магчымасцямі. Сын атрымае ад нас перспектыўную гаспадарку і, маючы большыя за нашы магчымасці, зможа яе разбудоўваць на свой лад, — заключае спадар Галэмбеўскі.

У Бельскім павеце найбольш заявак на структурныя сельскагаспадарчыя пенсіі паступіла з Браньскай гміны; з усходніх гмін па адной-дзве з вёскі. Як патлумачыў мне загадчык бельскага Павятовага бюро Агенцтва рэструктурызацыі сельскай гаспадаркі Валянцін Карыцкі, многім нашым сялянам цяжка задаволіць патрабаванні, неабходныя для атрымання структурнай пенсіі. Галоўнай загваздкай з'яўляецца патрабаванне пяцігадовых узносаў у KRUS. Многія сяляне працавалі па-за гаспадаркай, часта сторажамі, і аплачвалі складчыны ў ZUS, многія з'яўляюцца пенсіянерамі. У Браньскай гміне захаваліся сямейныя гаспадаркі, якія і задавальняюць патрэбныя крытэрыі.

Спадар Карыцкі мяркуе, што ўмовы, прапанаваныя хадайнікам за сельскагаспадарчай структурнай пенсіяй, карысныя. Калі хто перадае сваю гаспадарку патомку, ён па сутнасці яе не пазбываецца, а дастае яшчэ прыстойныя грошы. Асноўная велічыня сельскагаспадарчай структурнай пенсіі, гэта 210% мінімальнай пенсіі (цяпер 550 злотаў); верхні ліміт — 440%. Найчасцей трэба спадзявацца пенсіі ў трохсотпрацэнтным памеры.

Зацікаўленне структурнымі пенсіямі ў бельскім Павятовым бюро было вялікае. Ужо месяц раней людзі цікавіліся, якія дакументы патрэбныя. Пасля прыносілі запісаныя ўзоры і пыталі, ці добра іх афармілі.

Прымалі заяўкі з панядзелка, другога жніўня. У гэты дзень перад бельскім бюро чакала каля двухсот хадайнікаў. Сродкі масавай інфармацыі пасеялі паніку, што грошай хопіць не ўсім, таму чарга выстройвалася ўжо з ночы. З'явіліся ў камплекце і спадкадаўцы, і спадкаемцы. У першы дзень у Бельску прынялі 69 заявак.

У маштабе краіны ў найбольш перагружаныя першыя дні было прынята каля пяці тысяч заявак; урад спадзяецца каля шасцідзесяці тысяч. Апасенні, што камусь не хопіць грошай, а атрымаюць толькі першыя ў чарзе хадайнікі, не апраўдаліся. Спрагназіраваць лік заявак было складана, бо хадайніцтва за структурнымі пенсіямі вызначае шмат фактараў. Тут не толькі фармальныя патрабаванні наконт узносаў у KRUS, але і разлікі самых сялян. Для прыкладу, калі ў каго вялікая гаспадарка, якую трэба было б перадаць чужой асобе на ўзбуйненне, дык гэта не аплачваецца па той прычыне, што гектарныя даплаты ў гэтым выпадку будуць большыя за верхнія 440% мінімальнай пенсіі. А яшчэ той чужы можа турнуць з родных гектараў...

Ва ўсходніх паветах Падляшскага ваяводства ў першыя восем-дзесяць дзён заяўкі склалі: у Бельскім павеце — 127 земляробаў, у Сакольскім — 142 (у панядзелак 62 і каля трыццаці ў аўторак), у Беластоцкім — 150, у Сямятыцкім — 136 і ў Гайнаўскім — 47 (!). Даных з іншых паветаў ваяводства не ўдалося мне атрымаць.

Усё-ткі нават з прыведзеных лікаў сёе-тое відаць. Міжваеннае паслябежанскае гора і пазнейшае знаёмства з калгасным строем пахіснулі ў нашага земляроба любоў да карміліцы. У выніку сёння небагатаму і скептычнаму селяніну з усходняй сцяны зноў вецер у вочы, бо ў Еўрасаюзе дапамагаюць тым сялянам, што зямлёю даражаць.

Аляксандр Вярбіцкі

Серыял „Выбары" ☞ 2

Віктар Сазонаў

Усё ўпіраецца ў магічнае на Беларусі слова — „каб". Каб змянілі выбарчае заканадаўства, каб не праследавалі палітычныя партыі, каб не было ціску на кандыдатаў ад апазіцыі і іх каманды, каб прадстаўнікі партый і недзяржаўных арганізацый увайшлі ў камісіі, каб... Адным словам, каб усё было справядліва. Але ўжо першы этап кампаніі — вылучэнне ў акруговыя выбарчыя камісіі...

Беларус ад усяго ☞ 2

Сакрат Яновіч

Чым менш беларусаў, тым большая цікавасць да іх з боку саветаў і палякаў. Славуты Лукашэнка апошнім часам прысягаецца па-руску ў святасці яму беларускай мовы (перш грамадска знішчыўшы яе). Вывеўшы са школаў ды універсітэтаў. Нешта падобнае наглядаю ў палякаў: усё мацней кахаюць нас, аж пакуль не загібеем душою...

Купалінка ☞ 4

Міхал Мінцэвіч

Пасля поўдня на пашы для тарпанаў адбыўся чэмпіянат свету па кіданні кавальскіх абцугоў. Сярод мужчын перамог Яўген Пашко, які кінуў абцугі на адлегласць 29,14 метраў, атрымаўшы ва ўзнагароду чорнага барана. Другім быў Міхал Панасюк — 29 метраў і індычку, трэцім Яўген Скокін — 25,85 метраў і чорную курыцу...

Ва Украіне ☞ 5

Ганна Кандрацюк

— Едзь хутчэй, бо яйца абарву! — паганяў нашага ўкраінскага кіроўцу пагранічнік. Наш смех толькі падкрунуў „на плюс" яго настрой. — А вы што, разумееце па-ўкраінску? — здзівіўся і перасветліў нас зрокам ад галавы да ног, у гэты раз зусім неафіцыйна. — А чаму вы без мужыкоў выправіліся?..

Дыялогі над Бугам ☞ 9

Аляксей Мароз

Ад шасці гадоў дыялогі арганізуюцца як Агульнапольскія прэзентацыі культуры нацыянальных меншасцей. З першапачатковага ўкраінска-польскага мерапрыемства дыялогі пераўтварыліся ў імпрэзу, якая прэзентуе песні, музыку і танцы нацыянальных меншасцей пражываючых у Польшчы...

Алімпіяда ☞ 10

Уладзімір Хільмановіч

Самая вялікая беларуская каманда натуральна ў лёгкаатлетаў — ажно 42 спартоўцы. Магло быць і болей, але задоўга да пачатку алімпіяды са складу выбыў кідальнік кап'я Уладзімір Сасімовіч (паводле неафіцыйных даных з-за допінгу)...

Серыял „Выбары”

Каб выбары ў Палату Прадстаўнікоў Рэспублікі Беларусь сёлета праходзілі паводле дэмакратычных прынцыпаў і на раўнапраўнай аснове, то апазіцыя атрымала б у парламенце больш паловы месцаў. Такую думку выказвае большасць кандыдатаў у дэпутаты ад апазіцыі. І грунтуецца яна, паводле сцвярджэнняў, не на абстрактных разважаннях. Кааліцыя „Пяцёрка плюс”, у якую ўвайшлі асноўныя палітычныя партыі Беларусі, правяла грунтоўную працу сярод выбаршчыкаў. Намаганні ў гэтым кірунку рабілі і прадстаўнікі іншых блокаў. Вынікі гэтай працы сведчаць пра расчараванне шырокіх колаў грамадства сённяшняй уладай і жаданнем змен да лепшага, а таксама пра рост аўтарытэту апазіцыі і гатоўнасць прагаласаваць за яе. Але аптымізм наконт паспяховага выніку сваёй кампаніі ёсць далёка не ў кожнага апазіцыйнага кандыдата. Усё ўпіраецца ў магічнае на Беларусі слова — „каб”. Каб змянілі выбарчае заканадаўства, каб не праследавалі палітычныя партыі, каб не было ціску на кандыдатаў ад апазіцыі і іх каманды, каб прадстаўнікі партый і недзяржаўных арганізацый увайшлі ў камісіі, каб... Адным словам, каб усё было справядліва. Але ўжо першы этап кампаніі — вылучэнне ў акруговыя выбарчыя камісіі, пацвердзіў найгоршыя прагнозы аналітыкаў. Прадстаўнікі дэмакратычных палітычных партый атрымалі там 2,1% ад агульнай колькасці.

Нечаканасцю гэта не стала. Здзіўленне было б тады, каб апазіцыянеры атрымалі ў камісіях больш месц. Бо вопыт правядзення папярэдніх выбарчых кампаній і падрыхтоўка ўладных структур да гэтай, не пакідалі і цені сумневу, што будзе так, як ёсць. І хоць на прэс-канферэнцыі Лукашэнка заявіў, што ніякага ціску не будзе, мала хто яму паверыў. Бо кіраўнік дзяржавы паспяшаўся дадаць, што адсочыць, як мясцовыя органы ўлады выконваюць яго даручэнне. Даручэнне простае — у новым складзе мусіць быць 30% цяперашніх парламентарыяў. А яшчэ пабяцаў дапамагчы народу выявіць здраднікаў, адшчапенцаў і людзей, якія схаваліся як ваўкі ў авечую шкуру. Ну і дзеля эканоміі народных грошай, прэзідэнт выказаў жаданне правесці кампанію без дадатковых тураў.

На што можна спадзявацца зараз, калі ні акцыі пратэсту, ні галадоўка дэпутатаў групы „Рэспубліка”, ні заявы міжнародных структур, ні рэкамендацыі АБСЕ не паўплывалі ні на змену выбарчага заканадаўства, ні на сцэнарый выбараў. А вынік іх ужо агучаны — 30% былога складу, 30-40% жанчын, рэшта моладзі і ветэранаў. Пра квоту ад апазіцыі не згадвалася. А значыць, яе і не прадбачыцца.

Апазіцыя ў дачыненні да сёлетніх выбараў падзялілася. Кансерватыўна-хрысціянская партыя БНФ ад пачатку выступіла за байкот. Зыходзячы з набыткаў папярэдняга байкоту выбараў у парламент (непрызнанне вынікаў выбараў міжнароднай супольнасцю, гуртаванне на антыўладавым пратэсце беларускага грамадства і іншых), прадстаўнікі гэтай палітычнай плыні лічаць зараз байкот найбольш дзейсным сродкам. Многія з іх сцвярджаюць, што нават калі б удалося заняць усе месцы ў парламенце кандыдатамі ад апазіцыі, то рэальная ўлада ўсё адно засталася б у руках аднаго чалавека. Таму гульня па сцэнарыю, прапанаваным уладай, безвыніковая і пройгрышная ад самога пачатку. Яна можа прынесці толькі шкоду. Дазволіць легітымізаваць рэжым і надасць моц інтэграцыйным расійска-беларускім дакументам. Яшчэ падобны падыход пакажа непаслядоўнасць апазіцыі, і аслабіць яе аўтарытэт у беларускім грамадстве.

Большасць апазіцыі пайшла шляхам маленькіх крокаў. Выйгрыш хоць і невялікай колькасці апазіцыйных кандыдатаў на мясцовых выбарах і дзейнасць у самым парламенце групы „Рэспубліка” даюць надзею на пералом у перспектыве. Вынікі байкоту гэтай плынню разглядаюцца як малаэфектыўныя, яны, маўляў, не дадуць развіцця. Праўда, і тут гучалі розныя думкі. Грамада (БСДГ) паспрабавала пакінуць за сабой права на байкот. Гучалі галасы і сябраў іншых партый пра больш гнуткі, паэтапны сцэнарый. Ён прадугледжваў патрабаванні ад улад выконваць рэкамендацыі АБСЕ і мажлівасць байкоту ў выпадку невыканання іх на нейкім этапе. Але зараз вярнуцца да гэтага сцэнарыя практычна немажліва. Хіба толькі здарыцца нешта нечаканае. Большасць апазіцыйных лідэраў будзе ўдзельнічаць у выбарах і лічыць, што сам удзел прыносіць вялікую карысць, бо дазваляе легальна працаваць з выбаршчыкам.

Хто меў рацыю, пакажа час. Але ўжо зараз становіцца відавочным, што выбары на Беларусі ўсё больш нагадваюць лацінаамерыканскі серыял, дзе паглядзеўшы пачатак, можна дакладна прадказаць фінал. А таксама зразумець, хто стане героем наступнага серыяла, які па сцэнарыю не будзе розніцца ад папярэдняга. Застаецца спадзявацца, што серыялы беларусам урэшце абрыднуць.

Віктар Сазонаў (Гродна)

Беларус ад усяго



Я неяк казаў, што: чым менш беларусаў, тым большая цікавасць да іх з боку саветаў і палякаў. Славуты Лукашэнка апошнім часам прысягаецца па-руску ў святасці яму беларускай мовы (перш грамадска знішчыўшы яе). Вывеўшы са школаў ды універсітэтаў. Нешта падобнае наглядаю ў палякаў: усё мацней кахаюць нас, аж пакуль не загібеем душою (адзін католік з Лубнікаў прызнаецца, што нават любіць ужо спяваць дома праваслаўныя песні).

Польшча, наогул, не ўсведамляе сабе, што нас, беларусаў тут, даволі няшмат. На сваю бяду маю я нямала знаёмстваў у варшаўскай ды заваршаўскай Польшчы, і цяпер — у гарачае лета і вакацыі — яны наведваюць мяне ў Крынках. Я ім адзіны вядомы беларус і таму едуць або звоняць у маю хату з якімі хочаш пытаннямі.

Нагадаю пра нядаўнія. Тэлефон з рэдакцыі ілюстраванага „Пшэглёнду”: — Якімі людзьмі беларускія бабы?

А ўчора прыехала ажно двух з кулінарнай рэдакцыі Польскага тэлебачання: — Якія стравы любяць беларусы?

Пытанне ад „Пшыяцюлкі”: — Як выглядае каханне (разумей: секс) дзяўчат-беларусак да кавалераў-беларусаў, і якіх нечаканасцей павінен спадзявацца ад маладой беларускі малады паляк?

Прыбронтаўся ў Крынкі і пазнанскі дактарант з пытаннем:

— Як беларусы разумеюць экалогію, і ці яны разумеюць яе?

І не меней ідыятычнае з тых летніх (забаўных) пытанняў да Сакрата Яновіча: — Ці праўда гэта, што вы непаляк, а беларус, а калі так, то яшчэ дзе жыве гэтая нацыя і колькі яе? Толькі на Падляшшы? Бо далей Расія.

Мне сардэчна абрыдла выконваць ролю спецыяліста ў вачах палякаў па лініі ўсякіх „беларускіх пытанняў” — ад бабаў і паненскіх аргазмаў па экалогію і смачноты нашай кухні. Прычапіўся, вось, і „Кур'ер Паранны”, якому здаецца, што ўдасца гуманізаваць польска-беларускае сужыццё ў Беластоцкім Краі. Ён не верыць, што гэту праблему вырашаць толькі... могілкі, змена пакаленняў, і, як слушна сцвярджае прафесар Яўген Мірановіч: вырашыць усё найлепей само знікненне беларускай меншасці. Беларусы, праўда, не жыды, не трэба выганяць іх з Польшчы, бо самі паробяцца заядлейшымі за палякаў-католікаў, але ўсё ж застануцца яны, грэшныя кацапствам, другасортнымі палякамі, з кляймом схільных да нацыянальнай здрады. Такімі слабыя народы — ад Афрыкі да Камчаткі. А перад ахвочай самапаланізацыяй яны, беларусы, спачатку выраджаюцца біялагічна; мала дзяцей.

Прачытаў я ў жнівеньскай „Ніве” апавяданнейка Евы Сцепанюк „Залатое кальцо” (у гэтай дзяўчыны літаратурны талент!). Думаю, варта аддаць тэкст на англійскі пераклад у „Год Беларускі”, заходнія чытачы якога надакучылі з роспытамі пра колеры шызафрэннай дэпрэсіі ў беларусаў. Хай даведаюцца, дзякуючы гайнаўскай Еве (старажыдоўскае, біблейскае, імя на азначэнне жанчыны). Мы жыдам, Ева, павінны зайздросціць — яны ўмеюць думаць, і яны гэта далі нам Бога-Хрыста, а жыданенавіснікам Królową Polski.

Ад моманту, калі стала ясна, што нам ужо і święty Boże nie pomoże, бо мы як мужыцка-калгасная нацыя прагнем самазнішчэння, разам са сваёй нэндзай, я перастаў каго-колечы баяцца, акрамя Госпада. Сіндром расстрэлу! Пішу хроніку-гісторыю самазабойства галадушнай беларускай нацыі. Гэта адзінае, што мае цяпер сэнс рабіць.

На нашых украінцаў даўно гляджу літасціва: яны тыя ж беларусы; ніхто тут па-ўкраінску не загаворыць, масава і штодзень, як і ніхто не смуткуе за беларускамоўем (халопу нацыя — гэта не масла, на хлеб яе не намажаш). Гэта дадаткова адтуль і бяруцца дзіўныя госці ў мой дом, сваяцкія летнія турысты, бацькі і дзяды якіх пакутавалі ў тутэйшых вёсках на пясочных палосках. У іх, памешчанелых унукаў, абудзілася вось прага пошукаў радаводных карэнняў; бацькі, ганьбуючы родным бясхлебным лёсам, нічагуткі не сказалі ім наконт гісторыі радні, ваколіцы. Бядота не хваліцца ўласным, падшыўшыся пад чужое, найлепей шляхтаватае. Так парабкі парабіліся панамі, некаторыя па-разбойнаму п'янымі казакамі-запарожцамі („... іхав гультай козак з Украіны...”).

Дзіўныя госці ў мой дом, — моцна праваслаўныя, — маюць да мяне адзін і той жа жаль, менавіта: чаму я праваслаўных не перарабіў у беларусаў, сам жа будучы праваслаўным?! А яны ні ў чым не вінаватыя, толькі я і я! Вінаваты я нават у тым, што яны дзяцей гадуюць — або пагадавалі — палякамі.

Прызнацца: пачуваюся іншы раз, бы той некалі прарок Ілья (Клімовіч) з суседняй мне Грыбоўшчыны. Яшчэ трохі і пачну быць іконаю, да якое завозмуцца маліцца беларускія бацькі царкоўных палякаў. Але, я ім не вярну ў беларусы іх, ужо польскіх, дзяцей. Бо і нашто? А па-другое, гэта утопія. Чаканне цуду. Прырода цуду такая, што яго чакаецца, самому і пальцам не варухнуўшы, каб збыўся.

Я вінаваты, што беларусы перастаюць быць беларусамі! А што я магу ім зрабіць, каб захацелі яны быць сабою? Усё залежыць жа ад іх, а не ад мяне. Не буду вешацца ад роспачы. Зрэшты, такі мой учынак быў бы зразуметы як... антыбеларускі, бо антынародны, супраціўны волі ўсенароднай, абражальны люду; пры камуне дапісалі б антыпольскасць і антысацыялістычнасць (антыпартыйнасць не; выкінулі ж мяне з партыі трыццаць чатыры гады таму назад, якраз у верасні, чацвёртага, у дзень майго нараджэння ў трыццаць шостым у Крынках).

Не я выратую беларусаў, калі яны самі не выратуюцца. Няма цудаў, дарагія госці, як няма дарэмшчыны; на ўсё трэба запрацаваць.

Сакрат Яновіч

Вачыма еўрапейца

„Спецыяльны” нагляд

Сітуацыя вакол чыгуначных перавозаў на Падляшшы папахвае кпінай. Галоўныя героі гэтага гратэска — член Падляшскай управы Караль Тыленда і дырэктарка Падляшскага прадпрыемства рэгіянальных перавозаў Галіна Кужына. Абое яны не грэбуюць сродкамі і ў адносінах да сябе прымяняюць шантаж. Караль Тыленда тры тыдні таму пераконваў журналістаў:

— Перадамо чыгунцы на рэгіянальныя спалучэнні сёлета агулам 11 мільёнаў, але ні граша больш. Пані Кужына — не партнёр для размоў.

У сваю чаргу дырэктарка Кужына не ўступала і патрабавала 15 мільёнаў, абяцаных Міністэрствам фінансаў. У першыя дні жніўня заявіла ў сувязі з дакларацыямі Караля Тыленды аб адмяненні 34 — быццам нерэнтабельных — цягнікоў, хоць планаваная змена раскладу язды мела наступіць пазней. Найбольш іх мелі ліквідаваць на шляхах Беласток — Чаромха, Чаромха — Гайнаўка, Беласток — Саколка і Саколка — Кузніца-Беластоцкая. Прытым былі б гэта цягнікі, якія ад'язджаюць у час найбольшага пасажырскага руху: раніцай і папоўдні.

У спрэчцы паміж дырэктаркай Кужынай і Каралем Тылендам найменш лічацца галасы і думкі найбольш зацікаўленых — пасажыраў, жыхароў паўднёва-ўсходняй часткі Беласточчыны.

10 жніўня дайшло да сустрэчы „ў вярхах”. Апрача герояў спрэчкі (хоць ужо ж мелі не размаўляць), спрабавалі дайсці да паразумення непасрэдна маршалак Януш Кыжэўскі і галоўны прэзас суполкі Рэгіянальныя перавозы ПКП Януш Дэтляф.

— Мяркую, што ўдасца нам дагаварыцца не толькі да канца верасня, але і да канца года. Думаю, што ўсе рэгіянальныя перавозы і курсіроўкі цягнікоў, якія маюць важнае значэнне для рэгіянальнай грамадскасці, будуць захаваны, — сказаў на сустрэчы з прадстаўнікамі СМІ маршалак.

Пры нагодзе Караль Тыленда тады прызнаўся, што „калі самаўрад будзе мець большую фінансавую забяспечанасць, зможа перадаць чыгунцы дадатковыя сродкі”. Справа ў большых, чым прадбачвалася, уплывах ад падаткаў CIT і PIT. Раней, аднак, Тыленда агаворваўся, што грошы з гэтай крыніцы могуць быць прызначаныя на іншыя мэты, звязаныя, напрыклад, з аховай здароўя ці дарогамі. Цяпер гэта аказалася магчымым, новы расклад язды мае быць уведзены ад паловы снежня, прымаючы пад увагу ўсе 105 рэгіянальныя спалучэнні, але са зменамі ад'ездаў цягнікоў. Гаворка была, як сцвердзілі пасля спаткання „ў вярхах”, каб спалучэнні былі дастасаваныя да патрэб пасажыраў, значыць, каб былі больш рэнтабельныя. Можна паставіць пытанне: а чаму дагэтуль не былі дастасаваны і чаму аказаліся нерэнтабельнымі? Якімі калькуляцыямі ды аналізамі кіравалася ПКП, устанаўліваючы расклады язды і патрабуючы якраз 15 мільёнаў злотых, а не на 4 мільёны менш?

Дакларацыі маршалка Кшыжэўскага і дырэктара Дэтляфа, якія прэзентуюцца на інтэрнэтавых старонках „Варот Падляшша”, сайце Падляшскай маршалкоўскай управы, ніяк не ладзяцца з заявамі, якія апублікаваў пасля тых сустрэч „Кур'ер паранны”.

— Найраней цягнікі будуць адменены 21 жніўня, — гаварыла журналістам Галіна Кужына.

Прытым гарантавала, што адабрае расклад цягнікоў складзены па заказу ваяводскага самаўрада, які мае абавязваць якраз ад паловы снежня. Дык як тут разумець маюць гэту сітуацыю зусім здурнелыя пасажыры-падаткаплацельшчыкі? Каму тут верыць; будуць ці не будуць ліквідаваны да паловы снежня цягнікі, а калі так, дык колькі іх і якія? На гэтае пытанне, калі пісаў я гэты тэкст, не знайшоў адказу і пацвярджэння з абодвух бакоў. Цікава, ці вучні 1 верасня змогуць даехаць у школы і вярнуцца цягнікам дахаты. Гэта менш займае ПКП і самаўрад. Важнейшым ім здаецца даказванне сваіх дырэктарска-чыноўніцкіх рацый наконт няспраўнай польскай чыгункі, якая ніяк не можа рэструктурызавацца, і, што важнейшае, не спрыяе патрэбам пасажыраў, не толькі не дастасоўваючы расклады язды, але і ўмовы падарожжа (смурод, бруд, недахоп бяспекі). Цікава таксама, што пры пагрозе адмянення кожнага трэцяга цягніка ў рэгіёне маўчаць падляшскія парламентарыі. Што ж зробіш... Пакуль што, цягнікі ў Варшаву ходзяць, а яны ездзяць на іх задарма!

Мацей Халадоўскі

Большасць жыхароў Мілейчыч састаўляюць праваслаўныя вернікі — кампактна насяляюць яны ўсходнюю частку гміны. У вёсках на захадзе гміны жыве больш католікаў. Спрычыніліся да гэтага банды, якія пасля вайны запалохвалі праваслаўнае насельніцтва і прымушалі выязджаць у Савецкі Саюз...

Крыніца — сельская гаспадарка

У Мілейчычы прыйшлося мне выязджаць у пахмурнае надвор'е. На галоўным скрыжаванні, званым мясцовымі Рынкам, з'ехаў я пад пошту, каб прачакаць праліўны дождж. Праз акно відаць вялікую сінагогу з чырвонай цэглы, з забітымі дошкамі вокнамі. Тэрыторыя вакол яе прыбраная і прыгожа агароджаная. Мужчына, якога я спаткаў насупраць сінагогі, паказаў рукой і заявіў: „Тут усюды было жыдоўскае гета, а пасля іх вывезлі". Да вайны больш за палову жыхароў Мілейчыч састаўлялі яўрэі. Вялі яны млын, дзве кафлярні і займаліся гандлем. Той сам мужчына паказаў мне каталіцкі касцёл, распаложаны непадалёк скрыжавання, і нядаўна адрамантаваную праваслаўную царкву.

Войт Мілейчыцкай гміны Ананій Савіцкі сказаў, што зараз большасць жыхароў Мілейчыч састаўляюць праваслаўныя вернікі. Праваслаўныя кампактна насяляюць усходнюю частку гміны. У вёсках распаложных на захадзе гміны жыве больш католікаў. У вялікай ступені спрычыніліся да гэтага банды, якія пасля вайны запалохвалі праваслаўнае насельніцтва і прымушалі выязджаць у Савецкі Саюз. Напрыклад, у Паканеве жыве зараз мала праваслаўных сем'яў, а перад вайной праваслаўныя складалі большасць вёскі. Трагічныя ваенныя і пасляваенныя здарэнні і палітыка народнай улады мелі ўплыў на фарміраванне нацыянальнай свядомасці жыхароў гміны. Хаця старэйшыя жыхары Мілейчыч размаўляюць між сабой на мясцовай гаворцы, то ўжо іх дзеці і ўнукі размаўляюць на польскай мове. Дыялекты ў большай ступені захаваліся ў вёсках распаложаных у напрамку мяжы з Беларуссю, але і там наймалодшыя гавораць ужо па-польску. У час апошняга перапісу насельніцтва 13,9% жыхароў гміны заявіла, што яны па нацыянальнасці беларусы. Украінцамі назвала сябе — 20 асоб (0,84%).

— Я па нацыянальнасці беларус. Мой бацька і маці былі таксама беларусамі, — заявіў войт гміны Ананій Савіцкі, які нарадзіўся і выхаваўся ў Мілейчычах. Можа і таму атрымаў ён перамогу на апошніх непасрэдных выбарах войта. З жыхарамі гміны ў яго непасрэдны кантакт у гміннай управе і асяродку здароўя, дзе надалей працуе лекарам. На маё пытанне як яму ўдаецца спалучыць дзве прафесіі войт заяўляе: „Няма праблемаў. Можна сумяшчаць заняткі войта і лекара".

На фарміраванне беларускай свядомасці вялікі ўплыў мела навучанне беларускай мовы ў падставовых школах у Мілейчычах і Рагачах.

— Калі будуць ахвотныя, ёсць магчымасць вярнуцца да традыцыі навучання беларускай мовы, — кажа войт Ананій Савіцкі. — Можна арганізаваць у Мілейчычах беларускі калектыў. Аднак для гэтага патрэбны людзі, якія схочуць займацца грамадскай справай.

У цэнтры мясцовасці спатыкаю мужчыну ў сярэднім узросце, які ўжо чатыры гады застаецца без працы.

Войт Ананій Савіцкі: Я па нацыянальнасці беларус. Мой бацька і маці былі таксама беларусамі

— Працаваў я на чыгунцы, але страціў работу. Рашыўся вярнуцца ў родныя Мілейчычы і жыву з мамай, — расказвае суразмоўца. Грошы з матчынай пенсіі ледзь дазваляюць пражыць дзвюм асобам. Хаця ён можа працаваць на цяжкіх машынах і займацца зваркай, не мог знайсці ў наваколлі работы. Яго сябра, які да нас падыходзіць, працаваў зваршчыкам і таксама не можа знайсці занятку. Зімой рабіў у кацельні і спадзяецца, што ў час ацяпляльнага сезона зноў прымуць яго на работу. Трэцяя асоба, якую спатыкаю, знайшла сезонную работу пры ўкладванні тратуараў.

— Па пакупніках відаць, што заробкі ў нас малыя. Але адкуль жа возьмуць гаспадары сёння больш грошай, — гаворыць прадавец у магазіне. — Летам людзі збіраюць грыбы і наймаюцца да сезонных работ, то і ў магазіне даход большы. Зімой прыбытак малы.

Калі будуць ахвотныя, ёсць магчымасць вярнуцца да традыцыі навучання беларускай мовы. Можна арганізаваць у Мілейчычах беларускі калектыў...

Войт пацвярджае, што ў гміне многа беспрацоўных. Паводле яго падлікаў каля 100 асоб пастаянна шукае работу. Да сезонных работ, якія фінансуюцца гміннай управай і павятовым бюро працы, прымаюць толькі каля 20 чалавек. Многа маладых асоб рашылася выехаць за мяжу. Працуюць яны ў сельскай гаспадарцы і на будовах. Жанчыны даглядаюць за дзяцьмі і прыбіраюць кватэры. Спатканы мною жыхар Мілейчыч у Нямеччыне займаўся будаўнічымі работамі і працаваў у сельскай гаспадарцы. Зарабіўшы грошы, вярнуўся і разбудоўвае гаспадарку, выкарыстоўваючы нямецкі вопыт.

Калі раней праязджаў я праз Мілейчычы думаў, што тут галоўнай крыніцай заробку з'яўляюцца паслугі. Не ведаў, што многія жыхары займаюцца сельскагаспадарчай прадукцыяй і жывёлагадоўляй. Гаспадары пасвяць жывёлу на сенажацях раскінутых над Нурчыкам.

Мілейчыцкая гміна распаложана на тэрыторыі 15 тысяч гектараў і жыве ў ёй звыш 2,5 тысячы асоб. Лічыцца яна сельскагаспадарчай гмінай, з ухілам на гадоўлю быдла і прадукцыю малака. Найбольш быдла гадуюць у вёсцы Паканева. Гаспадары прыстасавалі там аборы да еўрасаюзных патрабаванняў і паставілі ўмяшчальнікі на малако. Зараз атрымліваюць больш чым 1 злоты за літр малака. У вёсках распаложаных ва ўсходняй частцы гміны землі намнога горшыя (V і VI класаў) і там даход з сельскай гаспадаркі меншы. На палях найбольш жыта і аўса, а мала пшаніцы, якая патрабуе добрай зямлі.

— Я буду намаўляць гаспадароў, каб заняліся вытворчасцю экалагічнага харчавання. У нас пад бульбу даюць толькі натуральнае ўгнаенне. Мінеральныя ўгнаенні дарагія і таму нават пад збожжа іх мала прымяняюць. Буду таксама раіць гаспадарам, каб заняліся агратурызмам. У Паканеве каля 100 гектараў пад рыбнымі ставамі. Адзін з іх выдзелены для турыстаў — аматараў рыбалкі, — кажа войт Савіцкі. Многа людзей з Варшавы, Шлёнска і іншых рэгіёнаў танна купілі драўляныя дамы, распаложаныя побач лесу. Свежае паветра і прыгожыя краявіды прыцягваюць аматараў здаровага адпачынку. Непадалёк ад Мілейчыч знаходзіцца звыш дваццацігектарны заліў. Каб турыстам можна было ім карыстацца, трэба яго ачысціць. Войт гаворыць, што на наступны год плануе правесці неабходныя работы.

Раней некаторыя жыхары Мілейчыч і навакольных вёсак працавалі ў нешматлікіх прадукцыйных і паслуговых прадпрыемствах. Пасля гаспадарчых перамен у Польшчы большасць іх абанкруцілася, а працаўнікі і да гэтай пары не знайшлі работы. Рэгіструюцца яны ў Павятовым бюро працы ў Сямятычах, каб мець страхаванне і лекарскую апеку. Калі жывуць бацькі-пенсіянеры, дапамагаюць ім фінансава. Некаторыя падзарабляюць у час сезонных работ фінансаваных часткова бюро працы. Зараз большасць жыхароў гміны — людзі ў старэйшым узросце. З некалькіх школ, якія дзейнічалі ў гміне, засталіся толькі Падставовая школа і Гімназія ў Мілейчычах, у якіх займаецца 260 вучняў.

Зараз па некалькі асоб працуе ў сельскагаспадарчым кааператыве і вінакурным заводзе. Больш месцаў работы ў школе і гміннай установе, але тут для фізічных работнікаў, якіх найбольш сярод беспрацоўных, магчымасці абмежаваныя. Магазіны, якія вёў гмінны кааператыў хутка перанялі прыватныя ўласнікі. Мясцовыя прадпрымальнікі найахвотней інвеставалі ў паслугі. Узніклі таксама тры сталярскія прадпрыемствы. Найбольшае сярод іх, якое называюць „тартаком", прадукуе на экспарт у заходнія краіны. Іншыя сталяры займаюцца паслугамі для мясцовага насельніцтва. Амаль у кожнага гаспадара па некалькі гектараў лесу і пасля высечкі жыхары прывозяць у сталярні драўніну для апрацоўкі.

— У Мілейчычах няма перспектыў на работу. Бедная гміна і землі слабыя. Калі ідзе дождж, мокра на палях, бо яшчэ за камуны не паспелі зрабіць меліярацыі і дрэнажавання. Калі моцнае сонца, то ўсё высыхае. Раней у гэтым было больш месц працы. Апошнім часам прыватны ўласнік закрыў нават бойню, бо трэба было б яму многа грошай выдатковаць, каб прыстасаваць яе да еўрасаюзных патрабаванняў, — гаворыць малады жыхар Мілейчыч.

— Ёсць сродкі на ўтрыманне ў тых сем'ях, дзе па двух пенсіянераў. Хаця даход невялікі, але пастаянны, — кажа іншы чалавек у сярэднім узросце.

У мінулым годзе на будову водаправодаў у Мілейчыцкай гміне выдаткавалі 520 тысяч злотых, але палову сродкаў вярнулі са структурных фондаў SAPARD. У гэтым годзе запланавана выдаткаваць на інвестыцыі каля мільёна злотых. Збудаванне водаправодаў у Харашчэве і Паканеве амаль закончыць будову водаправоднай сеткі ў гміне. Зараз рамантуецца школьны будынак, прадугледжаны рамонт дарогі Мілейчычы — Малеўшчына і асфальтаванне вуліцы Новы Свет у Мілейчычах і дарогі ў Ялтушчыкі.

— У будучыні трэба будзе заняцца дарогамі і думаць аб ачышчальні сцёкаў, бо сталі яны моднымі. Зараз многія гміны задоўжаныя. У нас няма ніякіх даўгоў. Што заплануем, тое і выканаем за ўласныя сродкі. Яшчэ з мінулага года засталося нам 260 тысяч злотых для выкарыстання сёлета і таму ў гэтым годзе не прадбачваем браць пазыку, — гаворыць войт Ананій Савіцкі.

З Мілейчычамі развітваюся ў сонечнае надвор'е, але на палях пуста. Дождж салідна змачыў другі пакос сена — галоўны корм для кароў.

Аляксей Мароз

Разлічваю на сумленнасць

31 ліпеня ўдзельнічаў я ў беларускім фэсце ў Кляшчэлях, які арганізаваўся над купальным басейнам. Развітаўшыся пасля канцэрта з сябрамі, пакінуў мімаволі на сцэне пляцоўкі фотаапарат з плёнкай. Памылку прыкмеціў у хаце. Наступнай раніцы падаўся я да знаёмых мужчын, з якімі сядзеў у час канцэрта і расказаў аб здарэнні. Абяцалі папытаць у крузе сяброў, якія ўдзельнічалі ў імпрэзе. З такою просьбай звярнуўся я да бурмістра Кляшчэляў і дырэктара ГОКа. Шкада мне плёнкі, на якой былі здымкі з апошніх чаромхаўскіх культурных мерапрыемстваў. А мо нехта знайшоў згубу і не ведае каму аддаць, дык прашу скантактавацца з Кляшчэлеўскай гмінай або ГОКам. Буду абавязаны. Лічу на добрасумленнасць знаходчыка.

Уладзімір Сідарук

Гайнаўка

Музей і асяродак беларускай культуры ў Гайнаўцы па вул. 3 Мая, 42 запрашае наведаць выставы: жывапісу „Белавежская пушча — геній прыроды", прац студэнтаў Універсітэта культуры ў Мінску (Беларусь) „Народнае дэкаратыўна-ўжытковае мастацтва", фатаграфічную выстаўку гайнаўскіх фотааматараў, дзіцячую выстаўку прац членаў мастацкага гуртка „Дэфармацыя" і гуртка мастацкай ткацкай вытворчасці „Габелен", якія дзейнічаюць у Гайнаўскім доме культуры пад кіраўніцтвам Зінаіды Якуць.

Выставы працуюць ад панядзелка да пятніцы ад 8 да 15 гадзіны ды ў суботу і нядзелю ад 12 да 17 гадзіны. **(мох)**

Ашуканства

5 жніўня рабіў я закупку ў краме „Сполэм" № 252, якая змяшчаецца ў Беластоку па вулі цы Каляёвай, 16. І вось што прыкмеціў. Прадаўшчыца да сумы закупкі прыпісала 0,50 зл. за пакет, хоць такога не выдала, бо тавар памясціла ў фольгавы мяшочак аднаразовага карыстання. Дагэтуль не здарылася, каб у краме прыбаўлялі за ўпакоўку. Па маёй думцы гэта звычайнае ашуканства. Цікава, ці дырэкцыя ПСС „Сполэм" ведае аб звычках прадаўцоў крамы пры чыгуначным вакзале? **(ус)**

Нараўка

20 жніўня г.г. праўленне Таварыства прыяцеляў Нараўчанскай зямлі (ТПНЗ) запрашае на летні баль членаў і сімпатыкаў ТПНЗ, які запланавалі ў Гмінным асяродку культуры ў Нараўцы па вул. Новай, 3 „А". Пачатак мерапрыемства ў 19^{30}.

За дэталёвай інфармацыяй можна звяртацца таксама па тэлефоне 685-80-34 ад 10 да 18 гадзіны. **(мох)**

„Купалінка" набірае размаху

Віцэ-чэмпіёнка Зофія Пашко з трафейнай індычкай. У цэнтры сужонства Галёнкаў, справа Адам Баер, галоўны суддзя спаборніцтва

24 ліпеня г.г. у агратурыстычнай гаспадарцы „Купала" Ірыны і Зіновія Галёнкаў, што ў Арэшкаве-Парыеве, адбылося штогадовае рэгіянальнае мерапрыемства „Купалінка". Галоўным пунктам праграмы быў V Агратурыстычны чэмпіянат свету па кіданні кавальскіх абцугоў. Паспрыяла надвор'е і публіка ў некалькі соцень асоб. Праграма мерапрыемства была, як заўсёды, багатая, а ў гэтым годзе асабліва — упершыню выступіла тут з вельмі багатым рэпертуарам бельская „Маланка", запэўніваючы шматгадзіннае гулянне. Можна было таксама палюбавацца страусамі, тарпанамі ды рэдкай сёння хатняй жывёлай, павудзіць, добра з'есці, выпіць, патанцаваць і, вядома, кінуць абцугамі ды выйграць жывую ўзнагароду. Хаця там сустрэліся розныя людзі, царыла, як заўсёды, сямейная атмасфера.

На ранча, як часам называюць уладанне спадарства Галёнкаў, леташняй восенню была пабудавана карчма, а сёлета назіральная вышка. Тут казачнае месца для адпачынку на ўлонні чыстай прыроды; многім гэта сапраўдны кавалак раю.

Да поўдня адбывалася спаборніцтва вудзільшчыкаў у лоўлі „залатой рыбкі", да якога прыступіла пад дваццаць змагароў. Пераможцы атрымалі кубкі-трафеі ў выглядзе рыб, апошнія ўдзельнікі — дыпломы. Галоўны прыз заваяваў Віктар Ігнацюк з Гайнаўкі, які злавіў тры кілаграмовыя карасі, другі быў Ежы Галёнка з Пасечнік, а трэцім прызёрам стаў бацька ўладальніка ранча, 84-гадовы Зіновій Галёнка.

Пасля поўдня на пашы для тарпанаў адбыўся чэмпіянат свету па кіданні кавальскіх абцугоў. Сярод мужчын перамог Яўген Пашко, які кінуў абцугі на адлегласць 29,14 метраў, атрымаўшы ва ўзнагароду чорнага барана. Другім быў Міхал Панасюк — 29 метраў і індычку, трэцім Яўген Скокін — 25,85 метраў і чорную курыцу. Сярод жанчын перамагла Бэата Цітко, кінуўшы абцугі на 18,97 метраў і ў якасці прыза атрымала белага козліка „Матолка". Другое месца ўзяла Зофія Пашко — 18,85 метраў і белую індычку, трэцяе Ірына Андраюк, якая перамагла два гады таму — кінула яна 18,48 метраў і атрымала курыцу.

Карчма „Пад чорным бараном" прыцягвала людзей м.інш. таму, што там выдзелены этнаграфічны куточак з даўніннымі беларускімі вясковымі прыладамі. Найбольш цікавілася імі моладзь з Варшавы, Гданьска, Быдгашчы; тутэйшых маладых гэта менш цікавіла.

Канцэрт „Маланкі" публіка ўспрымала з такім энтузіязмам, што не хацела расставацца з калектывам, выклікаючы яго звыш дзесятка разоў на біс. Забава на зялёнай мураве працягвалася да другой гадзіны ночы. Гулялі сотні людзей, у тым ліку амаль уся вёска Арэшкава. П'яных не было, ніхто ў ставе не ўтапіўся, хаця — традыцыйна — нехта ў ваду ўваліўся.

Слоў пару рэфлексій пра мерапрыемства папрасіў я сказаць гаспадара, Зіновія Галёнку.

— Такія імпрэзы расслаўляюць нас, калі ўсё ідзе добра. Яны даволі дарагія, каштуюць па некалькі тысяч злотаў і мы заўсёды да іх дакладаем. Утрыманне гаспадаркі каштуе каля дваццаці тысяч у год, а турысты пагашаюць адно каля 20% нашых расходаў. Аднак такія мерапрыемствы хочам арганізаваць далей і ўзбагачаць, напрыклад, аглядам старых гармонікаў, баяноў і акардэонаў. Гэта людзям падабаецца, некаторыя тэлефануюць, усхвалявана дзякуючы за забаву. У сваю чаргу мы з жонкай — думаю, што і госці мерапрыемства — вельмі ўдзячны дырэктару Сяргею Лукашуку і „Маланцы". Для многіх была гэта першая сустрэча з беларускай культурай на так высокім мастацкім узроўні. І госці вялі сябе культурна: на другі дзень прыбіранне доўжылася ўсяго пятнаццаць хвілін. З кожным годам гасцей у нас штораз больш, — заяўляе спадар Зіновій Галёнка.

Міхал Мінцэвіч

Нож у спіну?

Трэба было аж умяшання польскага Міністэрства замежных спраў, каб растлумачыць справу спробы давядзення да ўпадку адной з найбольшых фірм мясной перапрацоўкі з польскім капіталам на беларускім рынку — „Inco Food". Суд у Брэсце наклаў арышт на маёмасць, прыгаварыў канфіскату сыравіны (мяса) вартасцю двух мільёнаў долараў, ды, што важнейшае, наказаў заплаціць аж шэсць мільёнаў долараў штрафу за парушэнне мытных правілаў — кара вышэйшая за ўсю інвестыцыю. Польскія прадпрымальнікі, якія гандлююць з Беларуссю ўпэўнены, што гэта „мэтанакіраванае дзеянне, якое мае давесці прадпрыемства да банкруцтва".

Фірма „Inco Food", у якой працуе 800 чалавек, узнікла, паводле польскіх дыпламатычных крыніц, поўнасцю з польскім капіталам у першай у Беларусі Свабоднай эканамічнай зоне ў Брэсце. Магла яна разлічваць на рознага віду льготы, м.інш. падаткавыя. Перапрацоўвалася ў ёй польскае мяса і далей экспартавалася ў Расію. За апошнія тры гады беларускія чыноўнікі не заяўлялі ніякіх прэтэнзій да „Inco Food". Праблемы пачаліся ў канцы ліпеня. У той час брэсцкая мытная кантора ўзяла пад сумненне ўмовы складвання больш за тысячы тон мяса, прывезенага з Польшчы і захоўванага — як і раней — у халадзільні ў пасрэдніка ў брэсцкай СЭЗ. Аказалася, што той пасрэднік — на думку чыноўнікаў — не меў статусу г.зв. рэзідэнта, значыць, мяса не магло быць у складзе без мытнага афармлення. Да таго беларускія мытнікі сцвердзілі, што „Inco Food" павінна перахоўваць мяса на аснове дагавору аб арэндзе, а не — як было — на аснове дагавору аб складзе. 5 жніўня кіраўнікі фірмы атрымалі ліст, што маюць з'явіцца... праз некалькі гадзін у судзе. Дзякуючы польскаму МЗС, па просьбе аднаго з пайшчыкаў фірмы, адтэрмінавалі на адзін дзень. Судовы разбор кончыўся кур'ёзным прысудам.

Яраслаў Дрозд, віцэ-дырэктар дэпартамента інфармацыі МЗС у Варшаве, які займаецца справай „Inco Food", сказаў „Ніве":

— Ёсць тры элементы, якія выклікаюць нашу трывогу: фірма мела мала часу, каб сабраць доказы для абароны, пакаранне — неадэкватнае да правіннасці і, урэшце, стварыўся нядобры клімат, які кідае цень на польска-беларускі гандаль і інвестыцыі.

Дадаў прытым, што Польшча, незалежна ад рэстрыкцыйных загадаў Еўрасаюза, стараецца „падтрымліваць дабрасуседскі клімат з Беларуссю і весці з ёю як найшырэйшы гаспадарчы абмен".

— Мы ўспрынялі гэта як вельмі трывожны сігнал.

Раней, у размове з Польскім прэсавым агенцтвам, Дрозд прыйшоў да вываду:

— Прысуд накіраваны на здушэнне дзейнасці „Inco Food" у Беларусі.

9 жніўня ў польскае МЗС выклікалі пасла Рэспублікі Беларусь у Польшчы. Пазней у афіцыйным камюніке МЗС напісала: „Паслу была звернута ўвага, што такія дзеянні беларускага боку падрываюць верагоднасць Беларусі як эканамічнага партнёра. Выказваецца спадзяванне, што прыгавор гаспадарчага суда Беларусі, як суда вышэйшай інстанцыі, прыме пад увагу ўсе аспекты справы і створыць фірме «Inco Food» магчымасць далейшай дзейнасці".

Сяргей Нагорны з пасольства Беларусі ў Варшаве аб інцыдэнце сказаў „Ніве":

— Фірма „Inco Food" мае права абскардзіць рашэнне ў судзе вышэйшай інстанцыі. Гэта паасобны і выключны выпадак. Не адлюстроўвае ён становішча гандлёвых адносін паміж Польшчай і Беларуссю.

Пры нагодзе дадаў:

— Летась польскія інвестыцыі ў Беларусі ўзраслі на 50 працэнтаў. Сёлета яны вышэй ужо на 60 працэнтаў. Калі так пойдзе далей, польска-беларускае гандлёвае абарачэнне можа сягнуць мільярда долараў.

Нагорны не аднёсся да таго, ці фактычна пакаранне неадэкватнае да правіны фірмы:

— Кропка над „і" яшчэ не пастаўлена.

У апошнія дні ў справе „Inco Food" інтэрвеніравала ў мінскіх калег Краёвая гаспадарчая палата. Перад „Inco Food" інвестыцыю вартую мільён долараў страціў у Беларусі адзін з першых інвестараў з Польшчы — шакаладная фабрыка „Terravita" пад Мінскам.

Мацей Халадоўскі

Пад крыламі св. Мікалая

— То ж... там адна мафія! — хваляваліся за нас добрыя дзядзькі, з якімі на падсадку дабіраліся мы на Украіну.

Паводле палякаў, ужо за мяжой нас мелі абакрасці і адрэзаць галовы.

— *Mafia sycylijska to pryszcz w porównaniu z ukraińską,* — перасцерагалі нас, — *zabiją i nawet ręka nie drgnie.*

Хоць нашы шафёры ніколі не былі на Украіне, падказалі нам, як распазнаць мафію: *Jak zobaczycie samochód z przyciemnionymi szybami i facetów w okularach, to właśnie ONI.*

Ужо на мяжы ў Ягодзіне мы пачулі і адчулі свойска-сямейную, чуць не сіцылійскую стыхію.

— Едзь хутчэй, бо яйца абарву! — паганяў нашага ўкраінскага кіроўцу пагранічнік. Наш смех толькі падкрунуў „на плюс" яго настрой.

— А вы што, разумееце па-ўкраінску? — здзівіўся і перасветліў нас зрокам ад галавы да ног, у гэты раз зусім неафіцыйна. — А чаму вы без мужыкоў выправіліся? — кінуў яшчэ ў наш бок. Збітыя з панталыку мы пацiснулі плячыма.

Вось як літаральна і ментальна мы перасяклі раку Буг!

* * *

Слядамі продкаў, мы абедзьве, з журналісткай Домнай Іванчэўскай, адправіліся ў Пачаеўскі манастыр. Рашылі карыстацца яздой на падсадку. У Дарагуску мы падселіся да ўкраінцаў. Прыгарнуў нас Васыль з-пад Луцка.

— Як вы паломнікі, дык шчасце мне прынясеце, — голасна падумаў наш новы ахоўнік і пасадзіў нас на першыя месцы.

Мы, вядома, баяліся Васыля, бо дзядзька насіў цёмныя акуляры. Супакоіў нас рад іконак у яго машыне з св. Міколам Цудатворцам.

— Нашы ўкраінцы ездзяць у Чанстахову, а вы, палякі, у наш Пачаеў, — патлумачыў голасна Васыль. Такім чынам мы сталі цудадзейным дадаткам да Васылёвай кантрабанды.

Васыль — кантрабандыст з шматгадовай практыкай. Але ў першую чаргу ён працаўнік калгаса — механізатар.

Фота ГАННЫ КАНДРАЦЮК

Ужо за мяжой уразіў нас свойскі, сямейны клімат

— З адной пенсіі ў калгасе цяжка выжыць, бывае што цягам некалькіх месяцаў няма зарплаты, — апраўдваецца Васыль, — і як тут сям'ю выкарміць.

На Украіне форма падсадкі амаль не практыкуецца. Васыль таксама спачатку хацеў здзерці з нас на пляшку.

— Мы можам памаліцца за ваша здароўе, — прапануем шафёру, і ён радасна пагаджаецца.

З цягам кіламетраў Васыль мяняецца ў анёла. Частуе нас салам, хлебам і вадзіцай ды... добрымі радамі.

За спінаю, у багажніку гойдаецца кантрабанда — дзесяткі дзіцячых аўтафатэлікаў.

* * *

— Ці можна ў вас у садку разлажыць палатку, — пытаем сустрэтую на вуліцы цётку. У Крамянцы апынуліся мы на змярканні.

— Калі ласка, — запрашае гаспадыня, — калі хочаце, то і да хаты можна.

У доме Марыі Стасюк сустрэлі нас як родных. У прасторнай чырвонай мураванцы, разам з гаспадарамі жывуць дачка Надзя з мужам Алегам, сын Коля, унучкі — Людка ды Ангеліка.

Гаспадыня частуе нас цёплым сырадоем і варанай бульбай. Сядзім за сталом у летняй кухні і слухаем мясцовых аповедаў. У калгасе здаўна ўжо не выплачваюць пенсій. Часам выплацяць збожжам або прадуктамі.

— Лепш раскажу вам, як адзін з Луцка жонку ад мужа за тысячу долараў адкупіў, — пачынае жартаўлівы расказ Марыя. Цётка Марыся, як добрая мама, раніцай праводзіць нас у дарогу.

— А калі будуць цяжкасці, трэба малітву *Отче наш* згаварыць, — падказвае нам на развітанне. Абяцаем, што будзем асцярожнымі і што завязем запіску таксама за здароўе сям'і Стасюкоў.

— Я таксама за вас памалюся ў сваёй царкве, — узрушаецца гаспадыня.

У Крамянцы царква св. Мікалая Цудатворцы.

(працяг будзе)

Ганна Канрацюк

Будуем чарговую Польшчу

Мураваная павець, што на здымку, стаіць пры Баброўніцкай шашы. Раней тут быў аўтобусны прыпынак Грыбаўцы. Цяпер, пасля мадэрнізацыі шашы ў Баброўнікі, асталася толькі бяздзейная павець, а прыпынкі апынуліся ў іншых месцах. Адзін з іх, для аўтобусных ездакоў у напрамку Баброўнік, відаць злева — насупраць бачнай на здымку цыстэрны. Другі, у напрамку Гарадка і Беластока, справа, сто метраў перад самаходам.

Ці можна было пакінуць заезды на прыпынкі там, дзе ім пабудавана павець для пасажыраў? Гэтага я не ведаю. Мо сёння такі закон, што трэба як найдалей адыходзіць ад „сацыялістычнага" будаўніцтва. Мо праектанты дарогі (і заадно прыпынкаў) не ведалі, што там стаіць аб'ект дарожнай інфраструктуры. Мо прадстаўнікі мясцовага самакіравання былі рады навінкам. Мо яшчэ нешта прыдумалі пэкаэсаўская і дарожная адміністрацыі...

Будынак павеці ў добрым стане, нічога тут не разбурана. Ды і фарба на ім яшчэ не ўстарэла. Ён поўнасцю напагатове бараніць чакаючых пасажыраў ад дажджу і завірухі. І захіліць цяньком ад бачнай спёкі. Прыпынак гэты таксама не бязлюдны: жыхары Грыбаўцоў дакладна ведаюць расклад курсіравання аўтобусаў. І да мяне, калі я чакаў аўтобуса, далучыўся чалавек, які прыйшоў з боку страшаўскіх хутароў.

Фота АЛЯКСАНДРА ВЯРБІЦКАГА

У нашых сродках масавай інфармацыі часта ўзнімаецца шуміха, што чыноўнікі дзяржаўных і самаўрадавых органаў атрымліваюць замалыя аклады ў параўнанні з кіраўніцтвам прыватных офісаў. Я мяркую гэтаксама. За такія цяжкія роздумы над вызначэннем месца новых прыпынкаў належыцца ім калі не ўзбуйненне акладу, дык прынамсі парадачная прэмія!

(івар)

Прыемная сустрэча

31 ліпеня ў Чаромсе праходзілі VI „Польска-ўкраінскія музычныя сустрэчы", арганізаваныя Саюзам украінцаў Падляшша і мясцовым асяродкам культуры. У мерапрыемстве ўдзельнічалі айчынныя і замежныя калектывы. Імпрэза пачалася ў 17 гадзін з таго, як члены гурту „Горына" ад'ехалі „да шлюбу". Гэтым самым госці напомнілі чарамшанам традыцыю вясельнага абраду. Калі вясельны карагод у народных касцюмах пракаціўся вуліцамі пасёлка і вярнуўся пад ГОК, пачаўся канцэрт пад адкрытым небам. Госці паміж публікай прайшлі пад сцэну з вялікім караваем. Затым выступілі жанчыны з Чаромхі-Вёскі і „Вульчанкі" з Вулькі-Тэрахоўскай, „Родына" з Дубяжына, „Ранок" з Бельска-Падляшскага, „На межы" з Гайнаўкі і два ўкраінскія гурты „Горына" і „Косарі" з Роўна. Рэпертуар быў багаты і паасобныя нумары праграмы цёпла ўспрымаліся публікай. Мерапрыемству спадарожнічаў конкурс „Гавары па-свойму".

Варта адзначыць, што надвор'е і публіка не падвялі. Былі купцы з пражанай кукурузай, цацкамі, цукровай ватай ды смакоццем і півам. Аматары танца гулялі да раніцы пад гукі народнай музыкі, якую выконвалі ўкраінскія музыканты.

Уладзімір Сідарук

Беларушчына ў сапраўднасці

У „Ніве" многа ўспамінаецца пра колішніх беларускіх патрыётаў, якія пасля сябе пакінулі належны след — ці былі гэта палітыкі, ці вучоныя, ці літаратары. Многія з іх памерлі сваёй смерцю, але іншыя ў засценках сталінскіх катавальняў. Пасля іх засталося патомства, якому ўдалося даць драла за мяжу; многія апынуліся ў Польшчы. І вось з імі супрацоўнікі „Нівы" праводзяць гутаркі для нашай газеты. Але патомкі нашых патрыётаў, дзе б яны не былі, усе адракліся ад родных каранёў. Яны ўжо сёння не беларусы і ці варта траціць паперу, пішучы пра іх? Бо мы ж ім ніхто, як і „Ніва"... Але што гаварыць пра такіх, калі па ўсіх нашых вёсках дзеці гутараць і паміж сабою, і з бацькамі выключна па-польску, а „Ніва" і ўрокі беларускай мовы прадстаўляюцца ім нечым накшталт сцэнічнай пастаноўкі. Хай мне адкажуць паважаныя нашы бацюшкі Праваслаўнай царквы: на якой мове яны паміж сабою і дома гутараць?

Мікалай Панфілюк

Засохлыя дрэвы

Восем засохлых таполяў неабходна зрэзаць у Новым Ляўкове ды дзве сухія бярозы ля асфальтаванай дарогі са Старога Ляўкова ў Лешукі ў Нараўчанскай гміне. Засохлыя дрэвы таксама ля шашы з Гайнаўкі ў Нарву, між іншым, тры ліставыя на адрэзку з Кутавой у Храбустоўку, што ў Нарваўскай гміне. Такія дрэвы — пагроза дарожнаму руху. **(мох)**

Ганна Кандрацюк (zorka@niva.iig.pl)

зорка

для дзяцей і моладзі

Усю дарогу да мяжы мы праспявалі, выконваючы такія песні, як „Тры чарапахі" ці „Касіў Ясь канюшыну". На мяжы — цішыня, за мяжою песні „Сцяг" і „Пагоня"...

Фота АЛІНЫ ВАЎРАНЮК

Экскурсанты Міхал Каліна і Пётр Стэльмашук (на першым плане)

Наша экскурсія ў Беларусь

Беларусь — дзесяць мільёнаў жыхароў, дваццаць тысяч рэк, дзесяць тысяч азёр, Купала, Колас, Вольскі. Усё? Не. Гэта месца, якое блізкае кожнаму, хто адчувае сябе беларусам незалежна ад месца пражывання.

Вучні беластоцкай „чацвёркі", гімназіі н-р 7 і іх бацькі пад апекай настаўніцы беларускай мовы Аліны Ваўранюк мелі магчымасць паехаць на экскурсію ў Беларусь 11-12 чэрвеня 2004 года. Праграма паездкі прадугледжвала пабыўку ў Навагрудку, Міры і Гродне. На жаль, не прадбачвала яна таго, што трэба выспацца — зборны пункт пад школай — без пятнаццаці мінут шостая гадзіна раніцы. Усю дарогу да мяжы мы праспявалі, выконваючы такія песні, як „Тры чарапахі" ці „Касіў Ясь канюшыну". На мяжы — цішыня, за мяжою песні „Сцяг" і „Пагоня". За вокнамі аўтобуса зелень... Нарэшце даехалі мы ў Гродна. Калі спыніўся аўтобус, дзеці пабеглі да помніка Леніну і зрабілі сабе памятныя здымкі. У Гродне доўга мы не затрымаліся. Селі ў аўтобус і адправіліся ў Навагрудак — першую сталіцу Вялікага княства Літоўскага. Дзеткі разам з паняй Алінай і некаторымі бацькамі караталі сабе дарогу беларускімі песнямі.

Азнаямленне з Навагрудкам пачалося ад Дома-музея Адама Міцкевіча, які быў адкрыты 11 верасня 1938 года. У чэрвені 1941 года будынак быў знішчаны нямецкімі акупантамі. Адбудаваны музей да 100-годдзя з дня смерці А. Міцкевіча — у 1955 годзе. Выслухалі мы тут на прыгожай беларускай мове цікавую інфармацыю аб жыцці і творчым шляху вялікага паэта, а таксама пазнаёміліся ў залах музея з карцінамі і прадметамі штодзённага абыходу. Зрабілі тут сабе памятныя здымкі.

Пасля паехалі мы ў Мір, дзе знаходзіцца надта прыгожы замак. Даведаліся ад праваднікa, што Мірскі замак быў пабудаваны ў 1495-1510 гадах па загадзе маршалка Вялікага княства Літоўскага князя Юрыя Ільініча. Яго чарговымі ўладальнікамі былі розныя графы і князі. З другой паловы XIX стагоддзя аж да 1939 года ўладарылі замкам князі Святаполк-Мірскія. У розныя войны на працягу мінулых стагоддзяў замак пацярпеў паважныя разбурэнні. У 1969 годзе пачалася рэстаўрацыя занядбаных збудаванняў. З 1992 года аб'ект стаў філіялам Нацыянальнага мастацкага музея Рэспублікі Беларусь. З 2000 года замак уключаны ЮНЕСКА ў Спіс сусветнай культурнай спадчыны. Разглядалі мы ў залах замка розную старынную зброю, аднак найбольш нам падабаліся высачэзныя лесвіцы, па якіх трэба было ўзбірацца як па драбіне. Пры замку разлілося возера, у якім мы, на жаль, не купаліся.

Потым мы вярнуліся ў Навагрудак, дзе павячэралі і раскватараваліся. У пакоях крыху адпачылі і тады выбраліся на возера Свіцязь, якое такое чыстае і празрыстае, што нельга гэтага апісаць. Цяпер мы ведаем, чаму яно натхняла Адама Міцкевіча. Слухалі мы на беразе возера легенду аб затопленым на яго дне горадзе і пра Свіцязянку. Спявалі песні, а некаторыя, больш адважныя, пайшлі купацца.

Калі вярнуліся назад, а было ўжо цёмна, выбраліся мы на шпацыр па Навагрудку. Былі мы на гары, на якой, паводле падання, пахаваны князь Міндоўг — заснавальнік Вялікага княства Літоўскага. Увайшлі таксама на курган Міцкевіча насыпаны ў 1924-1931 гадах. Тут знаходзіцца зямля з усіх краін, у якіх жыў Адам Міцкевіч. У руінах Навагрудскага замка мы адспявалі „Маналог паўстанцкага каня" Сяржука Сокалава-Воюша, каб даказаць, што жыве ў нашых сэрцах мінулае нашай Айчыны. У гасцініцу вярнуліся мы перад поўначчу — змучаныя, але задаволеныя.

Наступнага дня пасля снедання — ізноў былі катлеты — мы паехалі ў Гродна. Горад заснаваны ў XII стагоддзі. Знаёмства з горадам мы пачалі ад Фарнага касцёла, які знаходзіцца ў цэнтры Гродна.

Неўзабаве апынуліся мы ля Каложскай царквы — помніка старажытнай мураванай архітэктуры, пабудаванай на высокім правым беразе Нёмана князямі Барысам і Глебам у другой палове XII стагоддзя. Гэта адзіны з помнікаў Гродзенскай школы дойлідства, які дагэтуль захаваўся. У 1853 годзе ў Нёман абвалілася паўднёвая частка заходняй сцяны, пасля чаго была зроблена кансервацыя помніка, дабудаваны драўляныя сцены і дах. Каля Каложы знаходзіцца аграмадны валун з выявай Пагоні, пры якім зрабілі мы памятны здымак.

Разглядалі мы таксама гродзенскі Стары замак, комплекс абарончых умацаванняў, культавых і грамадскіх будынкаў XI-XIX стагоддзяў. Замак узнік як старажытная крэпасць у канцы XI стагоддзя на высокім правым беразе Нёмана. Стаў ён асновай будучага Гродна.

У рэстаране „Беласток" мы пабедалі і пасля мелі тры гадзіны свабоднага часу. Маглі мы купіць сабе ласункі, дыскі „Н.Р.М.", а хто хацеў — мог нават набыць аграмадны партрэт прэзідэнта Аляксандра Лукашэнкі. Калі ўжо ўсе нацешыліся пакупкамі, селі мы ў аўтобус і адправіліся дамоў.

У Беластоку мы сардэчна падзякавалі сваёй пані Аліне за арганізацыю цікавай паездкі ў Беларусь. Пад школай мы праспявалі найлепшую на свеце песню „Тры чарапахі". Гэты выезд быў надзвычай карысны, і я лічу, што ў наступным годзе мы таксама наведаем блізкую нам Беларусь.

Дзякуем Консульству Рэспублікі Беларусь у Беластоку і Упраўленню адукацыі Гродзенскага аблвыканкама за дапамогу ў арганізацыі нашай паездкі.

Наталля Швед,
II кл. гімназіі ў Беластоку

Шпакова хатка

У гэты жнівень шпакі чамусьці рана сабраліся на перамовы наконт вяртання на зімоўку. Селі — ці не тысяча іх?! — на густыя драты лініі перасылу электратоку, што разыходзяцца на тры бакі свету, напятыя на стаўбах пасярод лугоў пад Белавежскай пушчай. Ад птушынага сейму нёсся гул, быццам кожны шпак ці і шпачыха ў адну хвілю хацелі ўзяць свой голас і выказацца наконт падарожжа ці таго, як пражылі свой час на тутэйшай зямлі, куды прыляцелі выхаваць патомства. А, можа, гэта маладыя шпачкі дзерлі дзюбы, каб даказаць, што і яны ўжо гатовы да першай у сваім жыцці вандроўкі на другі канец свету?

Яшчэ шпакі не паляцелі, як каля аднаго доміка, выгаднага, са свежае сасніны, з круглым акенцам ды палачкай дзеля таго, каб прысесці, закруціліся вераб'і. Вераб'іная сям'я — стары верабей з жонкай ды іхні чубаценькі чарнабокі сын, што жылі ў страсе старое шопкі, рашылі пашукаць сабе новага жылля. Мабыць, гэта таму сыну, ледзь сёлета аперанаму, не хацелася жыць у старой саломе, без выгад. Такое маладое пакаленне! — адно выгады давай, а калі не — кінуць дом і пойдуць шукаць лягчэйшага жыцця абы-куды, абы далёка ад свае хаты і сваіх простых, шэрых бацькоў. Хоць пры бацьках — цяплей, уежней, бо нават калі сын ці дачка ўжо сталыя, дык старыя ад свае дзюбы адымуць, каб лепшы кавалак аддаць бамбізу, якому самому працаваць не хочацца ці работа неадпаведная для шаноўнага маладзёна! Ну, дык і верабейчык Кірэйчык і намовіў сваіх бацькоў, каб хуценька заняць хату шпачынай сям'і. Ну бо і як — дарам тая ім і так дасталася. А зараз і паляцяць яны ў далёкі край, а праз мора і нягоды ўсялякія... усё можа здарыцца... А хатка як звон — шчыльная, чыстая, прыбраная, акуратная, на зайздрасць усім.

— Дык хоць пачакайце, хай адляцяць, — перасцерагала вераб'іха. — Яшчэ крыху, хай халадней стане... Дык ніхто не будзе мець да нас прэтэнзій...

Не счакаў Кірэйчык, ірвануўся займаць будку:

— А вы як хочаце, можаце і пад страхой зімаваць! Дарэчы, і адзін пражыву, тут на падворку есці шмат.

Рассеўся верабейчык Кірэйчык на палачцы пад хаткай, юркнуў у нутро, пабушаваў у шпачыных пярнатах. А тут і іншая дзюба ў акенцы з'явілася — шпакі вярнуліся, парадак у доміку навесці, пасядзець хвілю, памаўчаць разам, як і належыцца перад падарожжам.

Вось і даведаўся верабейчык, як лёгка чужое дастаецца. Сядзіць цяпер пад шопкай, накульгваючы падбірае чужое зерне, усім курам на смех.

Міра Лукша

Фота ГАННЫ КАНДРАЦЮК

Дзяўчынкі з польска-беларускага садка ў Беластоку

Фота ГАННЫ КАНДРАЦЮК

Тэатральны гурток з Орлі

Час рыцараў

Падарожжы і паломніцтвы

Старажытны Рым пабудаваў шмат акуратных, бітых дарог і трактаў. Але пасля развалу імперыі дарогі папалі ў руіну. Сярэдневечныя падарожжы сталі небяспечнымі. Яшчэ страшней было выправіцца на мора. Людзі верылі, што ў глыбі акіянаў аж кішыць ад усякіх страшыдлаў і цмокаў. Не менш палохалі і піраты.

Часам уладальнікі прыморскіх зямель ставілі фальшывыя марскія маякі. Калі да берага прыбівалі параходы і судны, іх звычайна рабавалі.

Дзеля такой самай мэты капалі ямы ў дарозе. Паводле закону, тавар, які ўпаў з воза, трапляў рыцару, якому належыла зямля.

На сярэдневечных дарогах можна было сустрэць купцоў і земляробаў, якія ехалі на кірмаш, рыцараў, што спяшаліся на турніры або стомленых паломнікаў. Часта паяўляліся студэнты, якія ішлі ў свой універсітэт. Сярод падарожнікаў нямала траплялася ўсякіх штукароў і бадзягаў, яны валачыліся ад замка да замка і прапанавалі свае спектаклі ды паслугі.

Самая кароткая дарога не заўсёды была найлепшай! Часам падарожнік абыходзіў шырокім кругам зямлю паганага рыцара. Трэба было зважаць і на лясных разбойнікаў. Таму людзі найахвотней хадзілі грамадою. Багатыя купцы перамяшчаліся пад збройным эскортам. Пасля змроку ўсе шукалі прытулку ў замку, манастыры або карчме. Але не заўсёды падарожнікаў сустракалі з адкрытымі рукамі.

Рух на дарозе заміраў у час веснавых растопаў і восеньскіх дажджоў. Бывала, што неразважны купец тануў у балоце разам са сваім канём і таварам.

(працяг будзе)

Зорка

Поле...

Цяжкія каласы
паволі нахіляюцца
да зямлі.
Паміж імі
ўсміхаюцца сінія васількі.
З неба ліецца жар,
а гарачая зямля
запаўняе цяплом
усё цела.
Сонейка цалуе праменнем
спяваючых птушак.
Усё чакае ночы...

Аня Іванюк, Гімназія ў Нарве

Польска-беларуская крыжаванка № 34

Запоўніце клеткі беларускімі словамі. Адказы (з наклееным кантрольным талонам) на працягу трох тыдняў дашліце ў „Зорку". Тут разыграем цікавыя ўзнагароды.



Адказ на крыжаванку н-р 30: Ас, авёс, гітара, музыкант, канапа, рок, парх. Ар, гук, лізак, тын, таката, рап, манарх, скрыпка.

Фота ЯНКІ ЦЕЛУШЭЦКАГА

Салістка Аня Івановіч са школы ў Новай Волі

Князь Яўстафій Сапега гэта нашчадак ружанскай лініі славутага магнацкага роду Сапегаў на Беларусі, другога па значэнні пасля Радзівілаў. Яго продкі ў Вялікім княстве Літоўскім займалі найвышэйшыя дзяржаўна-адміністрацыйныя і ваенныя пасады...

Вярнуўся на родную зямлю

З князем Астапам Сапегам (так, сказаў ён, называлі яго на Беларусі: не Яўстафій, а Астап) мы сустрэліся і доўга размаўлялі ў верасні 2000 года ў Беластоку, і нехта мог бы засумнявацца ў праўдзівасці слоў чалавека, які з Беларуссю развітаўся шмат дзесяткаў гадоў таму, а больш за пяцьдзесят гадоў пражыў у Афрыцы.

Але калі мы развіталіся, у яго голасе было столькі настальгіі, што мне самой стала смутна. Я жадаю 84-гадоваму князю аптымістычнага настрою, моцнага здароўя і добрага паветра ў Кеніі, а ён уздыхае ды кажа: „Добрае паветра, яно тут...".

Князь Яўстафій (Астап) Сапега гэта нашчадак ружанскай лініі славутага магнацкага роду Сапегаў на Беларусі, другога па значэнні пасля Радзівілаў. Яго продкі ў Вялікім княстве Літоўскім займалі найвышэйшыя дзяржаўна-адміністрацыйныя і ваенныя пасады.

Князь Астап пераконваў мяне, што першыя Сапегі не выводзіліся з полацкіх баяраў, а паходзілі з-пад Мінска, а княжацкі тытул атрымалі толькі ў 1700 годзе. Дарэчы, у канцы XVI — пачатку XVII стагоддзяў перайшлі з праваслаўя і кальвінізму ў каталіцтва.

Бурныя падзеі навейшай гісторыі не дазволілі Астапу Сапегу пайсці слядамі продкаў (яго бацька яшчэ быў паслом у Англіі, а пасля — міністрам замежных спраў ва ўрадзе Пілсудскага). Яго казачнае дзяцінства і маладосць перакрэсліла нямецкая агрэсія. У трыццаць дзевятым годзе, ужо скончыўшы вучобу ў Бельгіі, з другім палком уланаў у Сувалках ён пайшоў на вайну. Змагаўся пад Візнай. Пазней трапіў у лагер для ваеннапалонных. Пасля вайны апынуўся ў Кеніі, дзе ўжо былі яго бацькі. Расказваў, як страціўшы ўсё, трэба было пачынаць спачатку. Браўся за розную працу. Працаваў у фірме, якая збірала металалом — гэта былі цэлыя фабрыкі, масты, паязды, рэйкі. Меў самалёт, якім можна было лётаць па цэлай Афрыцы. Пасля ў суполцы з іншым чалавекам эксплуатавалі шахту з рубінамі. Усё гэта дало магчымасць заснаваць фірму, пра якую Астап Сапега марыў. Гэта фірма абслугоўвала сафары — афрыканскія паляванні. Ён быў прафесійным паляўнічым, без якога паляўнічыя не маюць права ехаць на сафары. Фірма дзейнічала каля дваццаці гадоў.

Фота АДЫ ЧАЧУГІ

Чатыры гады таму князь Астап Сапега сказаў мне: „Страціўшы ўсё, мы не зрабілі вялікай кар'еры, але, бадай, не гэта галоўнае. Я працаваў рукамі, гляньце якія яны, і не шкадую. Я жыў актыўна кожную гадзіну свайго жыцця. Шкада, што ў даны момант мая актыўнасць змалела".

З актыўнасцю — гэта не зусім так. У Беласток у 2000 годзе князь Сапега прыехаў на прамоцыю сваёй кніжкі *Tak było. Niedemokratyczne wspomnienia Eustachego Sapiehy*, надрукаванай Беластоцкім графічным прадпрыемствам. Вельмі добра тут робяць і даволі танна. Найлепшая друкарня! — казаў князь. Праз тры тыдні мела выйсці кніжка пра сафары. А ў 1995 годзе ён выдаў кнігу, якую пісаў 35 гадоў — энцыклапедыю Сапегаў на 800 старонках пад загалоўкам *Dom Sapieżyński*.

88-гадовы князь Астап Сапега памёр у кенійскай сталіцы Найробі 2 сакавіка 2004 года. Адмаўляла сэрца, пасля — лёгкія. Арганізм не прымаў ежы. У Кеніі Астап Сапега пражыў апошнія 56 гадоў свайго жыцця. 31 ліпеня 2004 года яго прах быў умураваны ў сцяну Сапегаўскай капліцы ў касцёле св. Антонія Падуанскага ў Боцьках, што каля Бельска-Падляшскага. Цяпер, бадай, ніхто не мае права сумнявацца, якая мілая была Яму колішняя Гарадзеншчына — яго родная зямля.

Спадар Багдан Камарніцкі, прыяцель сям'і Сапегаў, расказвае, што князь Астап доўга выбіраў сабе месца вечнага спачынку, думаў і так і сяк, разглядаўся па касцёлах, але пасля некалькіх візітаў на Беларусь (дзе, дарэчы, прысутнічаў на асвячэнні ў Дзярэчынскім касцёле мемарыяльнай дошкі з надпісам на беларускай мове ў гонар яго прадзеда Яўстафія Сапегі, удзельніка Ліста-падаўскага паўстання 1830 года) ён вырашыў, што павінен быць пахаваны бліжэй дому. Такім месцам на яго думку, магла б быць капліца ў боцькаўскім касцёле, пабудаваная адным з яго продкаў.

Спадар Багдан Камарніцкі, які надта дапамог мясцоваму ксяндзу каноніку Ежы Зыхару арганізаваць урачыстыя паховіны, паведаміў нам, што прыехала ў Боцькі каля 300 чалавек. Былі Радзівілы, Сапегі ды прадстаўнікі іншых арыстакратычных родаў, рассеяных па свеце, а таксама бліжэйшая сям'я Астапа Сапегі — усе тры дочкі Тэрэза, Марыя і Анна, а таксама апошняя жонка Альжбета з Гняздоўскіх.

Нішу з урнай у сцяне капліцы прыкрыла табліца з надпісам:

„Eustachy Seweryn książę Sapieha różański, 14.8.1916 — 2.3.2004, odznaczony Orderem Polonia Restituta i dwukrotnie Krzyżem Walecznych, historyk rodu". Унізе — герб „Ліс".

Побач — табліца, на якой увекавечаны прадстаўнікі роду Сапегаў, якія памерлі на чужыне. Яна была ўмуравана ў 2002 годзе, а зафундаваў яе князь Астап.

Астап Сапега спачыў усяго ў нейкай сотні кіламетраў ад роднага дому ў Спушы, што на дарозе між Гародняй і Лідай, у 10 км ад Скідаля. Тут нашчадак княжацкага роду нарадзіўся і з гэтым месцам ён быў духоўна звязаны на працягу свайго доўгага жыцця, нягледзячы на тое, што ад палаца сёння і следу не засталося. Гэта была яго зямля, і замілаванне да яе ён пранёс праз гады і падзеі. Тамашнія людзі яго яшчэ памятаюць. Жывучы сярод беларускага сялянства, хаця і ў палацы, ён сам сябе лічыў „тутэйшым", у душы быў вяскоўцам і не прападаў за вялікімі гарадамі. Яго падкупляў кантакт з прыродай, і гэта замілаванне дапамагло яму перажыць Афрыку, адчуць сябе больш-менш у сваёй стыхіі.

Неяк не магу сабе ўявіць, што князя Астапа ўжо няма сярод жывых. Быў гэта арыстакрат з крыві і косці — не надта тыповая асоба ў беларускім асяроддзі. Але гэты чалавек эманаваў беларускасць сваёй скромнасцю, адкрытасцю, пашанай да іншых, шчырым смехам. Смяяўся да слёз, калі я пачала расказваць па-руску анекдоты. Пасля пераслаў мне свае *Недэмакратычныя ўспаміны* з дэдыкацыяй: „З падзякай за прамілы вечар". Мяркую, што менавіта анекдоты выклікалі ў яго такія асацыяцыі.

Ада Чачуга

За і супраць

Сёння гаворыцца многа пахвальнага пра капіталізм і геройства лясных бандаў, што паўсюдна буянілі пасля вайны. І многа адмоўнага гаворыцца наконт народнай улады, якая трымалася ў нас працягам 45 гадоў, пакуль не развалілася пры дапамозе тых, якія яе трымалі.

Мы ўжо ведаем, бо многа пра гэта пісалася ў „Ніве" і ў каштоўных кніжных выданнях, чаго дасведчылі нашы беларускія продкі ў бежанстве, паспрабаваўшы спярша царскай улады, а пасля бальшавіцкай. І вярнуўшыся на радзіму апынуліся яны ў польскай санацыйнай дэмакратыі, якая сваімі паводзінамі нагадвала фашызм. Бо хто нават цікавіўся легальнымі газетамі і часопісамі, той апынаўся ў полі зроку паліцыі і дэфензівы; не згадваючы ўжо пра тых, якія належалі да Грамады або іншай левай арганізацыі — імі польскія турмы былі набіты да адказу.

Якая ж да вайны была дэмакратыя, калі летам наша жанчына поўзаючы цэлы дзень назбірала ў дзяржаўным лесе кошык ягад і пасля сустрэла польскага лесніка, які ўхапіў той кошык і патаптаў разам з ягадамі люта яшчэ яе лаючы? (Мо такія леснікі пасля трапілі ў Катынь). Была забарона збіраць у лесе ягады, але датычыла яна хіба толькі нашых людзей, якім былі недаступны і ўсе пасады ў дзяржаўных установах, так як нашым дзецям былі закрыты школы, якія давалі большую за пачатковую адукацыю і перспектывы жыцёвага прагрэсу.

Бальшавікі і, пасля, нямецкія акупанты вывозілі нашых людзей дзякуючы нашым даносчыкам, бо каб не было сваіх сабак, дык і чужыя нас не кусалі б. І ў нас тыя дэпутаты, што склалі спіскі „ворагаў" саветаў, пасля прыходу немцаў поўзалі на каленях перад людзьмі, каб тыя ім даравалі. І яны ім даравалі, але заміж падзякі ад іх пасля вайны дачакаліся помсты; відаць, такая чалавечая натура.

Пра сітуацыю маёй сям'і пры санацыі і пад нямецкай акупацыяй я ўжо пісаў у „Ніву". Пасля вайны было цяжка, бо вёска была спалена, і некаторыя людзі, у іх ліку і мае дзядзькі, паверылі бальшавіцкім агітатарам і выехалі ў савецкую дзяржаву. А мой бацька не верыў, гаварыў, што ўсё гэта няпраўда і абман, хаця на маё дзіцячае пытанне „Хто ў свеце найдужэйшы?", адказаў: „Саветы".

Новая ўлада налажыла вялікія налогі на тых, хто меў больш зямлі і людзі зімою часта выязджалі ў Варшаву, каб там падзарабіць. Але школы былі адкрыты ўсім дзецям і важнае месца ў ліку прадметаў навучання заняла беларуская мова. Хто быў здольны, той выбіўся ў людзі. У Дубічах-Царкоўных былі арганізаваны асобныя курсы для неадукаванай моладзі і хто меў жаданне, мог вучыцца далей.

У вёсцы была ліквідавана цераспалосіца і людзям стала жыць лягчэй. Быў націск уступаць у калгасы, якія Гамулка неўзабаве распусціў. Краіна адбудоўвалася, па вёсках выраслі прыгожыя новыя дамы. У 1950 годзе ў Дубічах была заснавана гміна і пошта; пажарная каманда і крама ўжо былі раней.

Сёння гаворыцца аб дыскрымінацыі тых, што хадзілі ў царкву. Але ў нас гэтага так не адчувалася як у бальшавіцкай Расіі, дзе людзі сапраўды цярпелі. Мы з бацькам запісаліся ў партыю, але скора я расчараваўся ёю. Праваліласяя яна, бо там правілі царыкі, якія патапталі яе ідэі і правату.

Мікалай Панфілюк

З'яднала іх культура

На „XIV Музычных дыялогах над Бугам", што 7 і 8 жніўня праходзілі ў Мельніку, сабраліся жыхары навакольных мясцовасцей, аматары культуры нацыянальных меншасцей і звычайныя турысты, разам каля трох тысяч людзей. На велізарнай стаянцы непадалёк гміннай управы можна было заўважыць машыны з Падляшскага, Мазавецкага і заходніх ваяводстваў. Ад шасці гадоў дыялогі арганізуюцца як Агульнапольскія прэзентацыі культуры нацыянальных меншасцей. З першапачатковага ўкраінска-польскага мерапрыемства дыялогі пераўтварыліся ў імпрэзу, якая прэзентуе песні, музыку і танцы нацыянальных меншасцей пражываючых у Польшчы. Першы раз выканаўцы выступалі на вялікай сцэне падрыхтаванай на сёлетняе мерапрыемства.

— У Мельніку жылі людзі розных нацыянальнасцей, мяшаліся шматлікія культуры і традыцыі. Быў ён заўсёды гасцінным для людзей розных культур і мы рашылі вярнуцца да традыцый, — заявіў войт Мельніцкай гміны Яўген Віхоўскі. Ужо чатырнаццаць гадоў працуе ён на пасадзе войта і з'яўляецца ініцыятарам дыялогаў.

Ва ўрочышчы Тапаліна, дзе выступалі калектывы, можна было спаткаць людзей усіх узростаў. Арганізатары — войт Мельніцкай гміны, Галоўнае праўленне БГКТ і Гмінны асяродак культуры ў Мельніку — падабралі калектывы з разнародным рэпертуарам. Мерапрыемства наведалі міністр замежных спраў РП Владзімеж Цімашэвіч і амбасадар РБ Павел Латушка.

Дыялогі распачаліся з выступлення гаспадароў, калектыву „Мельнічанкі". Жанчыны спявалі песні на вядомых ім славянскіх мовах, у гэтым ліку і на мясцовай гаворцы. Дыялект іх амаль супадае з гаворкамі з-пад Гайнаўкі і кіраўнік калектыву Надзея Дацэвіч ахвотна ўступіла са мной у размову на сваёй гаворцы. Паінфармавала яна, што калектыў „Мельнічанкі" дзейнічае з 1987 года і выступаў на многіх мерапрыемствах. Сама Надзея Дацэвіч з'яўляецца вядомай у Мельніку і наваколлі дзяячкай. Раней кіравала гуртком вясковых гаспадынь. Вучыла жанчын рыхтаваць харчаванне, а пасля ўзялася за спяванне.

Фота АЛЯКСЕЯ МАРОЗА

Літоўская капэла „Клюмпэ"

Найбольш калектываў спявала беларускія і ўкраінскія песні. Моладзі спадабалася выступленне гурту „Палац" з Мінска. Маладзёжны калектыў „Лучына" з Беластока прэзентаваў беларускія песні пад акампанемент даўніх інструментаў. Жанчыны з „Балалайкі" (Беласток) спявалі на беларускай, украінскай, цыганскай і польскай мовах. На ўсходнеславянскіх мовах выступалі мужчыны з гуртоў „Куранты" з Бельска-Падляшскага і „Дзікія палі" з Кракава. Апошні гурт вядомы польскай публіцы з музычнага афармлення фільма „Агнём і мячом". Некаторыя пачалі нервавацца, калі гурт „Чарамшына" доўга строіў інструменты. Тым, што засталіся ў суботні вечар даўжэй, канцэрт „Чарамшыны" вельмі спадабаўся. Сярод калектываў, якія выступалі на польскай мове, вылучаліся дзеткі з Сямятыч, якія зацікавілі публіку польскімі танцамі.

— Самым дасканалым паказаўся мне жыдоўскі калектыў „Ярэгма" з Кракава. Віртуозамі былі скрыпач і кларнеціст. У цэлым калектыў паказаў абсалютны прафесіяналізм, — заявіў інструктар ВААК у Беластоку Сцяпан Копа, які на гэты раз прыехаў на мерапрыемства прыватна. — Падабаецца мне, што публіка так спантанна ўспрымае розную музыку.

Літоўскую народную культуру паказаў калектыў „Клюмпэ" з Пуньска. Прыгожая вопратка, народныя літоўскія спевы і танцы спадабаліся публіцы, якая горача апладзіравала артыстам. Алену Руткоўскую з Беластока, што выступіла з сябрамі з заходняй Польшчы, пахвалілі за прафесійную прэзентацыю цыганскай музыкі.

— З кожным годам на мерапрыемства прыбывае штораз больш людзей. Раней прыгожа спявалі вясковыя калектывы, але апошнім часам выступае штораз больш калектываў, якія прэзентуюць вельмі высокі мастацкі ўзровень, а некаторыя з'яўляюцца сапраўднымі прафесіяналамі, — гаварыў вядучы Мар'юш Ажэлэк, які прысутнічаў на дыялогах у мінулым.

— Раней бывалі цікавыя грэчаскія, чэшскія, славацкія і жыдоўскія калектывы. Прыязджалі выканаўцы з Расіі і Нямеччыны, — паінфармаваў Віктар Дацэвіч, працаўнік Гміннага асяродка культуры ў Мельніку, які раней кіраваў гэтай установай і 8 гадоў займаўся арганізаваннем дыялогаў. — Публіку прыцягвае непаўторная надбужанская атмасфера. Узмацняюць яе начныя вогнішчы побач рэчкі.

Арганізатары наладзілі дадатковыя атракцыёны. Можна было паплысці па Бугу на невялікім караблі і ўзяць у пракат байдаркі. Мясцовыя вытворцы прапанавалі бульбяныя кішку, бабку і мясныя вырабы. Можна было паглядзець на працу каваля, ганчароў і спраўдзіць свае кавальскія і ганчарскія ўмеласці. Дзеці і моладзь маглі праехацца на кані, куплялі цукровую вату і марожанае. Прадаўцы прапанавалі таксама сучаснае харчаванне (фаст-фуды), але зацікаўленне ім было меншае. Паколькі мерапрыемства адбывалася ля самай ракі, многія турысты прыехалі са сваімі пакрываламі і раскладваліся побач Буга. На жаль, спевы некаторых выканаўцаў былі настолькі ўзмоцненымі, што не толькі людзі ў старэйшым узросце адыходзілі ад сцэны і станавіліся далёка ад выступаючых. Дзеткі гулялі на каруселі і прыладах для іх падрыхтаваных. Некаторыя турысты пакідалі мерапрыемства і ехалі паглядзець Замкавую гару з руінамі замка і рэшткамі ўмацаванняў старога гарадзішча. Увечары можна было паглядзець прыгожыя феерверкі.

Аляксей Мароз

Свята ў Кляшчэлях

Сяголетнія святкаванні Дзён Кляшчэляў праходзілі ў менш святочным настроі, паколькі напаміналася трагедыя з 9 ліпеня, у якой ад стыхіі пацярпела 211 забудоў у гміне ды 119 у самым мястэчку.

У суботу 31 ліпеня ў мясцовым ГОК сустрэліся члены мастацкіх калектываў з Дабрывады і Дашоў, каб адзначыць юбілей: дабрывадцы — 35-годдзя, а „Каліна" з Дашоў 25-годдзя існавання гуртоў. Бурмістр Кляшчэляў уручыў юбілярам віншавальныя граматы і падарункі. Быў торт са свечкамі. На святочным пачастунку члены калектываў і запрошаныя госці сустрэліся ў мясцовай карчме.

На стадыёне размясцілася „вясёлае мястэчка" з каруселю.

1 жніўня Галоўнае праўленне БГКТ арганізавала беларускі фэст. Імпрэзу ўдастоілі віцэ-консулы Рэспублікі Беларусь з Беластока Наталля Ярмоленка і Андрэй Франкоў, старшыня ГП Ян Сычэўскі і сакратар Валянціна Ласкевіч. З прамовай выступілі Аляксандр Сяліцкі і Ян Сычэўскі, якія напомнілі аб нядаўнім няшчасці, а бурмістр заявіў: „Гэты канцэрт прысвячаецца пацярпелым і тым, хто падаў для іх руку ў так цяжкую хвіліну". Канцэрт пачаўся з выступлення народнага ансамбля песні і танца „Стрэчанне" з Мазыра, які прывітаў публіку песняй „Добры вечар".

Вядучая канцэрт Марыя Клімовіч выклікала на сцэну калектывы з Дабрывады і Дашоў. У іх выкананні пачуліся сентыментальныя мелодыі маёй маладосці, напрыклад, „Ой, вішэнька, чэрэшэнька". Гурт „Зорка" з Беластока запрэзентаваў публіцы больш бадзёрую музыку ў рытме дыска-пола. Гледачоў заварожыў гурт „Шкляры" з Бярозаўкі. Госці запрэзентавалі не толькі беларускі фальклор, але і заспявалі на польскай мове дзве песні: „Daj mi tę noc" і „Na opolskim rynku". Мастацкую частку завяршылі „Прымакі". Іх касеты і кампакт-дыскі разыходзіліся ў час канцэрта як далікатэс. Пасля развітальнай „Ой ты Галю, Галю", вядучая выклікала на сцэну калектывы з Дабрывады і Дашоў. Сакратар ГП Валянціна Ласкевіч павіншавала юбіляраў ад імя Галоўнага праўлення. Залунала громкае „Многае лета", якое спявалі самадзейнікі з публікай.

Увечары ўдзельнікі фэсту гулялі на дыскатэцы ў рытм беларускіх мелодый. Святкаванні закончыліся паказам феерверкаў.

Арганізатары другі год паставілі сцэну над купальным басейнам. Публіка сядзела па абодвух баках вадзянога люстра і далёка ззаду, што перашкаджала ў наладжанні візуальнага кантакту артыстаў з гледачамі. А старая сцэна з бетоннай пляцоўкай, якая знаходзіцца насупраць уезду, пустуе. Праўда, патрабуе яна рамонту, але, як гаварылі кляшчэлеўцы, некалькі дошак прызначыў бы „Дрэвэксполь" у рамках супрацоўніцтва. Можна было б неабходны для рамонту матэрыял прыдбаць з вывернутых дрэў. Але ўсё гэта ляжыць у кампетэнцыі мясцовага самаўрада.

Уладзімір Сідарук

Спасаўскія запусты

Ужо дзевяты раз у Бельску-Падляшскім адбыліся „Спасаўскія запусты", арганізатарамі якіх выступілі Бельскі дом культуры і Бельскі аддзел БГКТ. Мерапрыемства, як заўсёды, карысталася зацікаўленнем бяльшчан, якія ў гэтым годзе выказаліся вялікім зразуменнем. Хаця канцэрт па прычыне клопатаў з электраэнергіяй пачаўся з гадзінным спазненнем, аднак чакаць было варта.

На сцэне дэбютаваў бельскі гурт „Жэмэрва", музычнымі кіраўнікамі якога з'яўляюцца Дарафей і Альжбета Фіёнікі. Дзявочы гурт заспяваў без акампанементу старыя песні з Падляшша і Беларусі, звязаныя з дажынкамі і спасаўскімі запустамі. Як зазначыў на пачатку выступлення Дарафей Фіёнік, „гэта песні проста з поля, усе яны запісаны былі ў часе падарожжаў, а гавораць пра цяжкі лёс гаспадароў, працу ў час жніва, каханне". Бяльшчане пачулі песні „Ой, розходіўся наш пан господар", „Просьба, коб пан одпустіў ужэ додому", „Ой, гукну, гукну". Зацікаўленне публікі выклікала назва гурту „Жэмэрва", якая абазначае групу моладзі або дзяцей.

Традыцыйна на сцэне бельскага амфітэатра паявіліся „Васілёчкі", „Куранты", „Зорка", да танца іграла „Маланка". Маладзейшая публіка чакала выступлення рок-гурту „Палац", музыка якога вядомая маладым беларусам.

Апрача музычнага мерапрыемства арганізатары прапанавалі жыхарам Бельска агляд фільмаў Тамары Саланевіч і Міколы Нестаровіча, ураджэнцаў Падляшша, якія родную зямлю апявалі ў сваіх кінакарцінах.

Традыцыя спасаўскіх запустаў доўгая. Нават у паганскі час людзі дзякавалі сваім багам за ўраджай, прасілі дапамогі ў жніве. Згодна з праваслаўным календаром спасаўскія запусты папярэджваюць пост, які рыхтуе вернікаў да свята Праабражэння Гасподняга. Такім чынам і ў гэтым годзе рыхтаваліся да яго бельшчане.

Паўліна Шафран-Асташэвіч

Менск — гэта жыццё „раёнаў” і „цэнтру”. Гэта пастаянная спрэчка сучаснасці з мінулым. Гэта сумесь постмадэрнізму, ампіру і трэш-культуры...

www.horad.exe.by

Мінае лета. Праўдападобна, што многія з чытачоў „Нівы” правялі канікулы не толькі за межамі родных гарадоў і вёсак, але і за граніцай. Магчыма, наведалі сталіцу Беларусі. У Мінску заўсёды ёсць на што паглядзець, чым падзівіцца. Але многае застаецца па-за аглядам звычайных турыстаў. Таму часцяком цікава паспрабаваць убачыць той ці іншы горад вачыма ягоных жыхароў. У дачыненні да Мінска нам дапаможа гэта зрабіць сайт, які знаходзіцца пад адрасам: www.horad.exe.by.

Галоўная старонка сайта выглядае вельмі неардынарна. На цёмна-шэрым фоне ў цэнтры выяўлення размешчаны фотаздымак старога аўтамабіля ў нейкім старым абшарпаным двары. Вышэй падаецца назва сайта, напісаная лацінкай — „Miensk”. Напрыканцы мінулага стагоддзя вакол менавіта такой назвы беларускай сталіцы было „зламана шмат коп'яў”. Лідэры нацыянальна-культурнага адраджэння спрабавалі дабіцца таго, каб гораду было вернута імя, якое ён меў у 20-30-ыя гады, калі ў Беларусі панавала хоць савецкая, але беларусізацыя. На жаль, аргументаванасць доказаў не перамагла і назва сталіцы беларускай краіны па-ранейшаму афіцыйна носіць свой расійска-польскамоўны варыянт.

Але вернемся да сайта. Пад здымкам размешчаны выхады да іншых ягоных старонак. Першая „Пра праект” раскрывае сутнасць і сэнс сайта, распавядае пра ягоных аўтараў і распрацоўшчыкаў. Пачынаецца яна з вершаваных радкоў аднаго з іх: „Я ў Менску нарадзіўся неяк ўвесну, /Тут я памру і тут пасьля ўскрэсну”. З гэтых слоў адразу можна зразумець, нават, не чытаючы далейшага тэксту, што сайт створаны маладымі адукаванымі людзьмі, закаханымі ў свой горад. Як яны пішуць аб ім: „Менск — гэта жыццё «раёнаў» і «цэнтру». Гэта пастаянная спрэчка сучаснасці з мінулым. Гэта сумесь постмадэрнізму, ампіру і трэш-культуры...” Побач здымак нейкага разбітага акна ў шурпатай сцяне — чыста гарадскі андэграўнд. Ніжэй размешчаны здымкі стваральнікаў сайта і магчымасці наладзіць з імі сувязь.

Наступная рубрыка „Артыкулы”. У ёй віртуальны турыст можа даведацца пра тое, аб чым не кажуць гіды падчас аўтобусных экскурсій па Мінску. Пяць артыкулаў у даволі цікавай форме распавядаюць пра той бок жыцця беларускай сталіцы, які можна ўбачыць, пражыўшы ў ёй не менш дзесятка гадоў.

Далей ідзе старонка пад назвай „Гасцёўня”. Гэта звычайны форум данага сайта, які нягледзячы на нядаўняе з'яўленне ўжо насычаны водгукамі наведвальнікаў. Практычна ўсе яны станоўчыя з пажаданнямі добрай далейшай працы над „Менскам”. Калі вы таксама адчулі патрэбу выказаць свае адносіны да яго — заходзьце ў „Гасцёўню”.

Рубрыка „Галерэя” па задумцы распрацоўшчыкаў мусіла нам паказаць Мінск у тых ракурсах, якія не трапляюць у прыгожыя падарачныя фотаальбомы. На жаль, ніводная з прадстаўленых фатаграфій не раскрываецца, а стваральнікі сайта паведамляюць, што ідзе канструкцыя і просяць зайсці на гэтую старонку пазней. Будзем спадзявацца, што гэтае „пазней” у дачыненні да старонкі не будзе сінонімам слова „ніколі”.

І апошняя старонка гэта „Спасылкі”. Тут размешчаны выхады на іншыя сайты, спіс якіх разбіты тэматычна — „Сябры”, „Музыка”, „Навіны” ды шмат чаго іншага.

Сайт „Менск” гэта сайт аб беларускай сталіцы, які варта наведаць кожнаму, хто цікавіцца ёй і здабывае інфармацыю з усіх магчымых крыніц.

Уладзімір Лапцэвіч

Беларуская дружына выступае ажно ў 23 відах спорту. У сталіцу Грэцыі выправіліся больш за 150 атлетаў, значная частка з якіх спадзяецца на запаветны медаль...

Беларусь, беларусы...

Хварэем за нашых!

Вось і распачаліся галоўныя спартовыя старты года. Беларуская дружына выступае ў Афінах ажно ў 23 відах спорту. У сталіцу Грэцыі выправіліся больш за 150 атлетаў, значная частка з якіх спадзяецца на запаветны медаль.

Самая вялікая беларуская каманда натуральна ў лёгкаатлетаў — ажно 42 спартоўцы. Магло быць і болей, але задоўга да пачатку алімпіяды са складу выбыў кідальнік кап'я Уладзімір Сасімовіч (паводле неафіцыйных даных з-за допінгу). Вельмі імаверна, што гэта не апошняя страта. Міжнародныя антыдопінгавыя структуры, здаецца, сур'ёзна ўзяліся змагацца за чысціню алімпійскіх ідэалаў. Салідна па колькасці выглядаюць беларускія весляры, кулявыя стралкі, штангісты.

У некаторых відах беларусы прадстаўлены адзінкавымі майстрамі. Так, у конным спорце за гонар краіны будзе змагацца толькі Ірына Ліс (у дапамогу ёй конь па мянушцы Пробліск), а ў ветразевым — Таццяна Драздоўская. На медалі яны не прэтэндуюць. Малакольксныя „дэлегацыі” стралкоў з лука, тэнісістаў, фехтавальнікаў — па два чалавекі, спартовых гімнастаў — толькі тры асобы. За айчынную школу гімнастаў і фехтавання асабліва крыўдна, бо ў гэтых відах беларусы маюць найбольшыя дасягненні ў гісторыі. Вырасла прадстаўніцтва баксёраў. Так на папярэдняй алімпіядзе выступаў толькі Сяргей Быкоўскі, а зараз ліцэнзіі здабылі ажно сем майстроў скуранай пальчаткі.

За гонар Беларусі будуць змагацца і сыны іншых народаў — якут Герман Кантоеў (вольная барацьба), чачэнец Хаважы Хацыгаў (бокс), дагестанцы Магамед Арыпгаджыеў (бокс) і Мурад Гайдараў (вольная барацьба).

Капітанам нашай дружыны аднагалосна абраная Эліна Зверава (невыпадкова Беларусь — жаночага роду). Найбольш тытулаваныя ў нашай камандзе вяслярка Кацярына Карстан (Хадатовіч), стралок Ігар Басінскі, гімнаст Іван Іванкоў, велагоншчыцы Зінаіда Стагурская (шаша) і Наталля Цылінская (трэк), сяміборка Наталля Сазановіч. Апошняя паехала ў Афіны з незалечанай траўмай, што выклікае прыкрасць. На чарговую алімпіяду ў сваім жыцці трапіў сямейны дуэт Ігар Астапковіч — Ірына Ятчанка. Астапковіч самы старэйшы сярод мужчын у беларускім складзе — яму 41 год. Столькі ж і Басінскаму. Сямейнасць заўважана і ў плаванні — у гэтым відзе выступяць сёстры Ганна і Марыя Шчэрбы.

Стартам беларусаў на летніх гульнях папярэднічалі некалькі скандалаў. Так не знайшлося месца ў складзе дэлегацыі заслужанаму трэнеру Беларусі па лёгкай атлетыцы Уладзіміру Фамічову, што выклікала моцнае абурэнне гэтага спецыяліста. Не трапіў у выязную групу таксама асабісты трэнер Басінскага Віктар Пятроў. Але сапраўды нацыянальны і міжнародны розгалас выклікала „дыскваліфікацыя” структурамі Еўрасаюза начальніка ўсёй беларускай алімпійскай дэлегацыі Юрыя Сівакова, колішняга кіраўніка Міністэрства ўнутраных спраў краіны, цяпер міністра спорту, аднаго з бліжэйшых паплечнікаў Аляксандра Лукашэнкі. Паводле аднаго з беларускіх інтэрнэтавых апытанняў 53% рэспандэнтаў ацанілі гэтае рашэнне як вельмі станоўчае, 22% — як вельмі адмоўнае. Сівакова справядліва не пусцілі ў Еўропу. І паведаміць пра гэта трэба было яшчэ раней. А беларускім спартоўцам будзе лягчэй псіхалагічна. Перажываем за нашых!

Уладзімір Хільмановіч

Курапацкая Галгофа

Пра лясны масіў Курапаты ведае амаль кожны жыхар Беларусі. Гэта адна з сумных і трагічных асацыяцый з гісторыяй. Цяпер пра лёс загінуўшых напамінае вялікая колькасць крыжоў. Пра забітых засталіся ўспаміны, драўляныя крыжы з іконамі і той неверагодны жах — за што загінула так многа ахвяр?!

Расказвае студэнт гісторыі БДУ, Васіль ЛЕМЕШ.

„Курапаты — гэта месца масавых расстрэлаў людзей з часоў сталінскіх рэпрэсій, пераважна 1937-1941 гадоў. Большасць расстраляных паходзіла з Заходняй Беларусі і Польшчы (Беласточчына, Гродзеншчына). Ёсць шмат указанняў пра тое, што гэта былі сталінскія расстрэлы. Менавіта, існуюць сведчанні людзей, што тут не стралялі ні немцы, ні партызаны, а савецкія карныя органы НКВД.

Месца гэтае выкрыў Зянон Пазьняк і шэраг іншых археолагаў, якія праводзілі тут даследаванні напрыканцы 1980-х гадоў. Цяпер гэта адно з памятных месц, кожны год на Дзяды прыходзіць народ і ўшаноўвае памяць загінуўшых. Паводле разлікаў даследчыкаў на гэтым месцы расстраляна больш за 90 тысяч людзей.

Восенню 2001 г. мела быць пабудавана кальцавая дарога праз Курапаты. У праекце яна закранала курапацкі помнік, таму шэраг маладзёжных арганізацый, нацыянальна-патрыятычных сіл аб'ядналіся, каб супрацьстаяць дзяржаве ў руйнаванні гэтага помніка. Яны паставілі крыжы ўздоўж урочышча Курапаты і сфарміравалі брыгады аховы, якія мелі кругласутачную варту, на працягу якой прыходзілася супрацьстаяць сілам міліцыі, розным дыверсіям (напрыклад, падпалам іхняй палаткі). Некалькі чалавек

www.barcnews.org

www.times.spb.ru

пацярпела ад дзеянняў праваахоўных органаў, а адзін трапіў у рэанімацыю. Дарога была пабудавана, але помнік астаўся. Улады меркавалі паставіць таксама ўрачысты помнік з зоркай, у чыста камуністычных традыцыях, але народ не дазволіў. Вырашылі, што застануцца крыжы з цэнтрам на вярху гары, званай Галгофай.

Падчас акцый, якія праходзяць кожны год на Дзяды, удзельнічае шмат інтэлігенцыі, у тым ліку Алесь Марачкін, мастак, які напісаў ікону Божай Маці Курапацкай. Прыхільнікі Беларускай аўтакефальнай царквы лічаць яе вялікай святыняй”.

Іконы, якія пасля памяшчаюцца на крыжах на магілах расстраляных людзей, піша і Анатоль Кузняцоў. Ён родам з вёскі Адаеўшчына, Радзішчоўскага раёна ў Расіі. Мастак — жывапісец, рэстаўратар ікон, іканапісец. Атрымаўшы блаславленне на пісанне ікон, ён у 2001 г. стаў прыхаджанінам Свята-Уваскрасенскай царквы ў Мінску і там піша іконы. Некаторыя іконы ён прывозіць на ўрочышча Курапаты, як малітоўную памяць пра жахлівае мінулае.

Анна Садоўская

БЕЗДАПАМОЖНАСЦЬ ДАМОЎ САЦЫЯЛЬНАЙ ДАПАМОГІ

Сёлета змянілася заканадаўства аб сацыяльнай дапамозе. Істотным чынам мяняюцца прынцыпы фінансавання многіх важных задач, у тым ліку альтэрнатыўнай апекі і дамоў сацыяльнай дапамогі. Новыя законы, паводле Павятовага цэнтра дапамогі сям'і (ПЦДС) у Бельску-Падляшскім нясуць шматлікія пагрозы.

Рада павета на майскім пасяджэнні азнаёмілася з дзейнасцю ПЦДС у мінулым годзе і ў першым квартале сёлетняга. Загадчыца ПЦДС Уршуля Кітляс мяркуе, што заканадаўчыя змены ў сферы сацыяльнай дапамогі выразна паказваюць адступленне дзяржавы ад яе падтрымкі. Фінансавая нагрузка на задачы па сацыяльнай дапамозе ўскладваецца на гміны і паветы, якіх сённяшнія фінансавыя магчымасці паступова слабеюць. Прыкладам можа быць лёс асоб, якія патрабуюць неадкладнага пасялення ў дом сацыяльнай дапамогі, дзе сярэдні кошт утрымання аднаго падапечнага роўны 1 350 злотаў у месяц, калі сам падапечны павінен аплаціць 350 злотаў. Такім чынам гміна дзеля ўтрымання там свайго жыхара павінна даплачваць тысячу злотаў у месяц; найчасцей сям'я не ў змозе аплаціць пабыўку сямейніка ў доме сацыяльнай дапамогі. Зважаючы на факт, што сёлетні бюджэт самаўрадаў не толькі не пабольшаў, але нават паменшаў у параўнанні з леташнім, выкананне гэтых задач немагчымае па фінансавых прычынах. Прадбачваючы выследкі такой сітуацыі самаўрадавыя асяродкі сацыяльнай дапамогі, змагаючыся за выжыванне, не будуць кіраваць патрабуючых у дамы сацыяльнай дапамогі. Альтэрнатыўным рашэннем у такіх абставінах можа стаць пашыранае прымяненне сурагатных форм апекі, якія, аднак, ніколі не дараўнаюць апякунчым, культурным і эстэтычным паслугам публічных дамоў сацыяльнай дапамогі. Зважаючы на наступствы абмежавання прытоку патрабуючых, гэтым установам пагражае закрыццё, што давядзе да бездапаможнасці, беднасці і адзіноцтва пажылых людзей.

Аналагічная праблема кранае таксама і апякунча-выхаваўчыя ўстановы рэсацыялізацыйнага і сацыялізацыйнага характару. З будучага года кожны павет будзе вымушаны фінансаваць са свайго бюджэту пражыванне там сваіх выхадцаў. У наяўнасці сем'і нячаста змогуць аплачваць прабыванне дзяцей у тых установах і павету давядзецца плаціць за іх каля тысячы злотаў у месяц, што разам складзе каля чатырохсот тысяч у год. З гэтага года павет, з якога дзеці прабываюць у альтэрнатыўных сем'ях на тэрыторыі іншага павета, абавязаны фінансаваць гэтае прабыванне. Паралельна да таго бюджэт краіны адступіў ад субсідыяў на альтэрнатыўныя сем'і, спыняючы датацыі і цяпер павет павінен сам выхадайнічаць сродкі на гэтую мэту. На заканчэнне Уршуля Кітляс падкрэсліла, што кожны чарговы год будзе вельмі складаным у фінансавым плане. Самаўрадам невядомая ўрадавая стратэгія фінансавання задач па сацыяльнай дапамозе на бліжэйшыя гады. Калі дзяржава не ўзмоцніць падтрымкі гмінам і паветам, складана будзе гаварыць пра апякунчую і спрыяльную сям'і дзяржаву.

Як сведчаць паведамленні Галоўнай статыстычнай управы, наша грамадства старэе і расце ў ім доля людзей у поствытворчым узросце. У Падляшскім ваяводстве ў 2002 годзе сярэдняя працягласць жыцця жанчын перавышала 80 гадоў; такі ж паказчык для мужчын быў на дзесяць гадоў меншы. Улічваючы прагнозы на 2050 год, працягласць жыцця ў жанчын выйдзе на 85 гадоў, а мужчын на 78, а кожны пяты жыхар ваяводства перавысіць постпрадукцыйны ўзрост. Паралельна будзе меншаць адсотак насельніцтва давытворчага ўзросту. Гэтая перспектыва паказвае патрэбу ўтрымання дамоў сацыяльнай дапамогі.

У Бельскім павеце працуе падлеглы старостве Дом сацыяльнай дапамогі ў Браньску разлічаны на 117 душ; апрача гэтага дзейнічаюць кругласутачныя прыватныя дамы сацыяльнай дапамогі. Мадэрнізацыя Дома сацыяльнай дапамогі ў Браньску, якая праходзіла ў 2000-2002 гг., з прычыны нястачы фінансавых сродкаў не была завершана. Працуе там вугальная кацельня, якая забруджвае асяроддзе, а за забруджванне трэба плаціць. Канчатковае ўпарадкаванне браньскай установы прадбачана ў плане развіцця Бельскага павета на 2004-2006 гады.

Міхал Мінцэвіч

Падарунак

З'яўляюся я членам аднаго клуба, адкуль атрымоўваю заказаныя кніжкі ды тавары — цэны там даступныя. Дзякуючы гэтаму я карыстаюся лякарствам „Глюкозаміна" па цане больш чым напалову танейшым як у аптэцы.

Клуб прыманьвае кліентаў падарункамі. Я атрымаў газавую запальнічку, але па сённяшні дзень не ведаю як ёю карыстацца — інструкцыя напісана на замежнай мове. Гандлёвыя фірмы, якія распаўсюджваюць імпартныя тавары павінны задбаць, каб інструкцыя была зразумелай карыстальніку мове. **(ус)**

Вялікае беспрацоўе ў нашым рэгіёне давяло да сітуацыі, што амаль кожны з нас мае сярод сваіх сямейнікаў ці знаёмых асоб, якія шукаюць працу. Каб неяк памагчы такім людзям, вядзем рубрыку „Дапамагаем з «Нівай»". Побач бясплатна будзем змяшчаць аб'явы людзей, якія шукаюць працу або могуць даць працу. Сардэчна запрашаем усіх чытачоў дасылаць у рэдакцыю свае прапановы. Рубрыку вядзе Паўліна Шафран-Асташэвіч, з якой можна кантактавацца па мабільніку нумар 0600 635 425 (або ў рэдакцыі па панядзелках ад 10 да 12 — тэл. 743 50 22).

ШУКАЮ ПРАЦУ

• Мужчына шукае працу ў Беластоку, сярэдняя адукацыя, свая машына, стаж механікам легкавых машын, тэл. 653 31 62.

• Краўчыха з практыкай шукае працу ў Беластоку, тэл. 0 502 370 486.

• Аператыўны мужчына шукае працу ў Беластоку, асноўнае веданне нямецкай і рускай моў, абслуга камп'ютэра, правы кат. В, тэл. 0 608 210 435.

• Студэнтка ахвотна заапякуецца малым дзіцём, тэл. 0 508 820 414.

• Электрамеханік, сярэдняя адукацыя, кніжка здароўя, правы кат. В, свая машына, тэл. 0 692 438 475.

• Шафёр, правы кат. АВС, шукае працу ў Падляшскім ваяводстве, тэл. 651 67 55.

• Малады сталяр шукае працу, свая машына, тэл. 743 19 57.

• Жанчына, 27 гадоў, правы кат. В, добрае веданне рускай і англійскай моў, аператыўная, шукае працу ў Беластоку, тэл. 0 692 660 704 (інтым і сецевы маркетынг не прапаноўваць).

• Жанчына, 47 гадоў, шукае часовую працу ў Бельску-Падляшскім, тэл. 730 63 16.

• Мужчына, 35 гадоў, стаж у пякарні, кніжка здароўя, шукае працу ў Беластоку, тэл. 0 507 600 470.

• Маладая жанчына без дрэнных схільнасцей ахвотна заапякуецца дзіцём, закончаны педагагічны інстытут, вопыт, тэл. 0 609 294 448.

• Салідны механік шукае працу ў Беластоку, тэл. 676 17 64.

• Маладая жанчына, 25 гадоў, без дрэнных схільнасцей, сярэдняя эканамічная адукацыя, шукае працу ў Бельску, тэл. 0 501 948 311.

• Малады мужчына, 23 гады, сярэдняя адукацыя, абслуга камп'ютэра, добра ведае нямецкую мову, шукае працу ў Гайнаўцы або ў Бельску (інтым і сецевы маркетынг не прапаноўваць), тэл. 0 501 443 234.

• Жанчына, 47 гадоў, працавітая, шукае працу ў Беластоку, тэл. 711 83 49.

• Жанчына, 27 гадоў, вышэйшая эканамічная адукацыя, правы кат. В, кніжка здароўя, фіскальная каса (інтым і сецевы маркетынг не прапаноўваць), тэл. 0 506 489 040.

• Жанчына, 45 гадоў, дакладна прыбяру, смачна звару, не п'ю і не куру, тэл. 717 70 98.

• Студэнтка заапякуецца малым дзіцём, Беласток, тэл. 718 84 13.

• Студэнтка, 23 гады, кніжка здароўя, санітарны мінімум, правы кат. В, шукае працу ў Беластоку, тэл. 0 503 614 932.

• Прадавец, 42 гады, вопыт, правы кат. В, свая машына, без дрэнных схільнасцей, шукае працу ў Бельску, тэл. 0 694 828 464.

• Абітурыентка рускай філалогіі шукае працу ў Беластоку, правы кат. В, добрае веданне англійскай мовы, закончаныя камп'ютэрныя курсы (інтым і сецевы маркетынг не прапаноўваць), тэл. 732 60 27.

• Мужчына, 27 гадоў, вышэйшая тэхнічная адукацыя, сумленны, шукае працу ў Беластоку, тэл. 0 693 075 252.

Дапамагаем сабе ўзаемна

У Бельску: 720 20 06

• Шасціасабовая сям'я патрабуе пледаў, пасцелі і адзення для дзяцей ва ўзросце 5, 8, 9 і 12 гадоў.

• Маці-адзіночка трох сыноў (9, 11 і 13 гадоў) будзе ўдзячная за любую дапамогу.

• Сям'я патрабуе адзення і абутку для дзяцей (хлопцы — 5, 8, 9 гадоў, дзяўчынка — 7 гадоў).

• Сям'я патрабуе мэблі, пасцелі, адзення для хлопцаў ва ўзросце 9, 10 і 11 гадоў.

• Сям'я просіць дапамогі ў выглядзе дзіцячага адзення, пасцелі і яды.

• Самотная маці з хворым дзіцём будзе ўдзячная за ўсякую помач.

• Сям'я з дзяцьмі ва ўзросце 4, 9,12 гадоў будзе ўдзячная за любую помач.

• Сям'я патрабуе старога халадзільніка і яды.

У Беластоку: 732 01 86; 712 11 53

• Старэйшае сужонства, якое выхоўвае ўнукаў, патрабуе мэблі, пасцелі і ботаў для 5- і 10-гадовых хлопцаў і 7- і 11-гадовых дзяўчат.

• Сям'я будзе ўдзячная за помач у выглядзе пасцелі, адзення для дзяцей (7, 8, 13 і 14 гадоў).

• Сям'я патрабуе пасцелі, пледаў і ўсякага нязнішчанага адзення для дзяўчат ва ўзросце 7, 11 і 14 гадоў.

• Сям'я, якая выхоўвае трое дзяцей, патрабуе штаноў і лёгкіх блузак для хлопцаў ва ўзросце 10 і 13 гадоў, ботаў і адзення для 5-гадовай дзяўчынкі.

• Тры сям'і з Відава, што каля Бельска-Падляшскага, ахвотна аддадуць зімовыя курткі, мужчынскія і жаночыя штаны, світэры і іншае нязнішчанае адзенне, тэл. 730 40 00.

• Аддам дзіцячае адзенне ў добрым стане, тэл. 7454484.

Сабрала Паўліна Шафран-Асташэвіч

Абвесткі

Адукацыйна-музейны цэнтр Белавежскага нацыянальнага парку ў Белавежы (у Палацавым парку) запрашае на выставу „Царскі палац у Белавежы", якая знаходзіцца ў тамашняй палацавай браме. Глядзець яе можна кожны дзень (апрача панядзелкаў) ад 9 да 16 гадзіны. **(мох)**

Ніва
ТЫДНЁВІК БЕЛАРУСАЎ У ПОЛЬШЧЫ
PL ISSN 0546-1960
NR INDEKSU 366714

Nakład: 1 053 egz.
Выдавец: Праграмная рада тыднёвіка „Ніва".
Старшыня: Яўген Вапа.
Адрас рэдакцыі: 15-959 Białystok 2, ul. Zamenhofa 27, skr. poczt. 149.
Тэл./факс: (0 10xx 85) 743 50 22.
Internet: *http://niva.iig.pl/*
E-mail: *redakcja@niva.iig.pl*

Zrealizowano przy pomocy finansowej Ministerstwa Kultury.
Галоўны рэдактар: Яўген Вапа.
Намеснік гал. рэдактара: Віталь Луба.
Сакратар рэд.: Аляксандр Максімюк.
Рэдактар „Зоркі": Ганна Кандрацюк-Свярубская.
Публіцысты: Міхась Андрасюк, Мікола Ваўранюк, Аляксандр Вярбіцкі, Ганна Кандрацюк-Свярубская, Міраслава Лукша, Аляксей Мароз, Ада Чачуга, Паўліна Шафран-Асташэвіч.
Канцылярыя: Галіна Рамашка.
Камп'ютэрны набор: Яўгенія Палоцкая, Марыя Федарук.
Друкарня: „Orthdruk", Białystok.
Tekstów nie zamówionych redakcja nie zwraca. Zastrzega sobie również prawo skracania i opracowania redakcyjnego tekstów nie zamówionych. Za treść ogłoszeń redakcja nie ponosi odpowiedzialności.
Prenumerata: 1. Termin wpłat na prenumeratę na IV kwartał 2004 r. upływa 5 września 2004 r. Wpłaty przyjmują urzędy pocztowe na terenie woj. podlaskiego i oddziały „Ruch" na terenie całego kraju.
2. Cena prenumeraty na IV kwartał 2004 r. wynosi 26,00 zł.
3. Cena kwartalnej prenumeraty z wysyłką za granicę pocztą zwykłą — 120,00; pocztą lotniczą Europa — 133,00; Ameryka Płn., Płd., Środk., Afryka, Azja, Australia — 147,00. Wpłaty przyjmuje „RUCH" S.A., Oddział Krajowej Dystrybucji Prasy, ul. Jana Kazimierza 31/33, 01-248 Warszawa, Pekao S.A., IV O/Warszawa, Nr 68124010531111000004430494.
4. Prenumeratę można zamówić w redakcji. Cena 1 egz. wraz z wysyłką w kraju wynosi 3,45 zł, a kwartalnie — 44,85 zł; z wysyłką za granicę pocztą zwykłą — 4,70 (kwartalnie — 61,10), pocztą priorytetową: Europa — 5,90 (76,70), Ameryka Płn., Afryka — 6,60 (85,80), Ameryka Płd., Środk., Azja — 7,40 (96,20), Australia — 9,60 (124,80). Wpłaty przyjmuje Rada Programowa Tygodnika „Niwa", Białystok, ul. Zamenhofa 27, nr konta BPH PBK SA Oddział w Białymstoku 77 1060 0076 0000 4011 5001 5504.

„Даўціпы"
Андрэя Гаўрылюка

Да пажылай савецкай грамадзянкі прыехалі журналісты і просяць расказаць пра эпоху цара Мікалая.

— У час рэвалюцыі, — пачынае яна...

— Ведаем, як было ў рэвалюцыю, — перабіваюць журналісты. — Вы нам раскажыце, як было пры цары.

— У час рэвалюцыі, — зноў пачынае бабулька...

— Вы нас не разумееце: мы хочам даведацца пра ўмовы жыцця пры цары!

Жанчына знервавалася і павысіла голас:

— Дазвольце мне сказаць! У час рэвалюцыі быў такі беспарадак, што мне дапісалі пяцьдзесят гадоў...

* * *

Журналіст пытае амерыканскага фермера:

— Вашы суседзі не абкрадаюць вас?

— Такога не бывае.

— Дык чаму ля куратніка стаіць стрэльба?

— Менавіта таму яны і не крадуць, што яна там стаіць.

* * *

Настаўніца пытае вучня:

— Чаму ўчора не быў у школе?

— Вадзіў карову да быка.

— А бацька не мог гэтага зрабіць?

— Пэўна, што мог, але бык гэта робіць спрытней.

* * *

Мікола папіваў сам у бары. Выпіваючы чарговы кілішак ён вымаў нешта з кішэні, прыглядаўся і зноў хаваў ды заказваў чарговую чарку. Бармен пацікавіўся ў Міколы, на што ён прыглядаецца.

— Гляджу на здымак маёй жонкі, — патлумачыў госць. — П'ю да той пары, аж пачынае яна мне падабацца; тады іду дадому.

* * *

У канцылярыю адной з вашынгтонскіх парафій звоніць тэлефон:

— Ці спадзяваецеся прэзідэнта на нядзельным набажэнстве? — пытае ўсхваляваны голас.

— Гэтага не магу абяцаць, — адказвае пастар, — але спадзяемся Бога і веру, што гэтага хопіць для з'яўлення некалькіх вернікаў.

* * *

Дзве сяброўкі:

— Бачыла Марусю? Ну і брыдкая!

— Так, аж прыемна паглядзець.

Музычная размова...

... з Падолем з гурту „Triquetra". У мінулым годзе ў час фестывалю „Басовішча" гурт з Аструды заваяваў узнагароду войта Гарадоцкай гміны.

Т.С.: — ***Вы другі раз на гарадоцкай сцэне. Падабаецца вам тут?***

Падоль: — Вядома, востры дым. Вельмі спантанная публіка. Граем на многіх канцэртах, не толькі ў Польшчы, і на прыкладзе „Басовішча" можна сказаць, што чым далей на ўсход, тым лепшая атмасфера пад сцэнай. Думаю, што ў нейкім сэнсе тут і палітычная сітуацыя беларусаў не без уплыву. Людзі прыязджаюць у Польшчу, дзе агромная асабістая свабода і адчуваюць сябе так, як бы хапілі Бога за нагу.

— ***Ваша прыгода з беларускасцю не завяршаецца толькі на фестывалі „Басовішча". Гаворыцца, што хочаце таксама запісаць свой новы альбом і ў беларускамоўным варыянце?***

— Альбом пішам у студыі Роберта Фрыдрыха (Літва), вядомага польскага музыканта з самых лепшых „чадэрскіх" польскіх гуртоў: „Acid Drinkers", „KNŹ", „Flap Jack" і г.д. Роберт таксама наш прадзюсар і не дазволіць нам, каб гэты матэрыял быў кепска зроблены. З'явілася таксама прапанова зрабіць усё і па-беларуску. Наш сябра Віталь зараз перакладае тэксты і я з вялікай ахвотаю іх праспяваю. Думаю, што калі ёсць песні і словы, якія ў змозе некаму дапамагчы ў нечым, дык чаму не?.. Усе зараз

фота www.triquetra.kdm.pl

пішуць двухмоўныя альбомы з накіраваннем на англійскую мову. Мы адкрываем сябе ўсходняму слухачу — беларусам.

— ***Трэба дадаць, што ваша песня „На прагул" цалкам някепска апошнімі днямі заваёўвае беларускія гіт-парады. Зараз яна на музіне гітоў (http://music.fromby.net)...***

— Што цікавае, мы пра гэты поспех даведаліся зусім нядаўна. Прыемна.

— ***Дык чакаем новага альбома. Дзякуй за размову.***

— Хачу перадаць прывітанні ўсім беларусам. Дзякуй!

Гутарыў Татка Стэп

Музычныя навіны

Беларускія ўлады афіцыйна ваюць з беларускамоўнымі рок-гуртамі. Сітуацыя складаная. Ва ўсе СМІ была накіравана дырэктыва, у якой абвяшчаецца не трансляваць у эфіры песень гуртоў „Нэйра дзюбель", „Палац", „Н.Р.М.", „Друм экстазы", „Крыві" і Аляксандра Памідорава.

Справа дзіўная. Цэлы свет пабачыў здарэнні з Мінска ад 21 ліпеня ў час палітычнага мітынгу супраць афіцыйным уладам. Пасля адбыўся рок-канцэрт, а гурты, якія на ім выступілі, зараз занесены ў „чорны спісак". Здзіўляе, што на спіску апынуўся і добра вядомы ў Польшчы гурт „Крыві", які ў той час у Мінску не канцэртаваў.

На шчасце самі пакрыўджаныя не надта пераймаюцца забаронай. Не першы раз падобнае адбываецца. Да таго і бясплатная рэклама.

Як калісь спяваў Хрыстафор Сяськевіч з гурту „Кардон":

Недзе ў сярэдзіне Эўропы
Ёсць дзіўная краіна...

Татка Стэп

22.08 – 28.08

Баран (21.03. — 19.04.) Трыгон Марса да Юно 20 — 27.08. дазволіць табе паспяхова адкрыць спосаб вырашэння канфліктаў у сужонстве. Уступіць у вас новы дух і вернецца супольнае захапленне. У хаце скаштуеш цяпла. Поўнае паразуменне з сябрамі.

Бык (20.04. — 20.05.) Твая прыродная нясмеласць прападзе. Сустракайся з людзьмі — будзеш мець інфармацыі і весткі. Хтосьці з сям'і цябе можа сасватаць. Не перапрацуешся. Думай аб дастатку.

Блізняты (21.05. — 21.06.) Не сядзі дома — свет для цябе мае шмат неспадзевак і атракцыёнаў. Да 25.08. — многа энергіі і радаснага настрою. Набярэш ахвоты паказаць свае скрываныя таленты.

Рак (22.06. — 22.07.) Зноўку рэнесанс у пачуццях. Гармонія дома. Ці не зачаста забягаеш да сяброў і не задоўга там сядзіш? Мо запрасі іх лепш да сябе ў госці? Калі шукаеш заробку — шукай у апошніх днях месяца.

Леў (23.07. — 22.08.) Да 25.08. заззяеш — талентамі, ідэямі, рэфлексам. Высокая інтэлектуальная спраўнасць. Спадзявайся гасцей, якія будуць мець ахвоту засядзецца.

Дзева (23.08. — 22.09.) Будзеш больш самастойная, не будзеш так лёгка паддавацца ўплывам іншых. Паправа настрою, вера ў сябе і прабойнасць. Добры час на ўзмацненне сяброўскіх сувязей. Час на шчырасць — 25 — 29.08.

Шалі (23.09. — 23.10.) Дадатковыя абавязкі. Многа непаразуменняў. Магчымасць кампрамісаў. Самотныя Шалі могуць непрытомна закахацца „на ўсё жыццё".

Скарпіён (24.10. — 21.11.) Новыя, адважныя дзеянні, на якія ты раней не заўсёды мог сабе дазволіць. Магчымасць прыбытку, калі працуеш у турызме, агратурызме, адукацыі, сельскай гаспадарцы і медыцыне.

Стралец (22.11. — 21.12.) Пагодлівы тыдзень, з невялікімі хмарамі. Не затрымлівай кагосьці сілай, хто ад цябе ўцякае. Знакаміты адпачынак. Паразмаўляй з сямейнікамі. Павер у сэнс тваіх дзеянняў, тады будзеш мець поспех.

Казярог (22.12. — 20.01.) Ахалоджанне ў партнёрскіх сувязях; занадта чапляешся дэталяў, траціш з вачэй сутнасць справы. Не пераймайся тым, на што не маеш уплыву. Могуць азвацца старыя нямогласці, не жартуй ды адразу ідзі да лекара.

Вадалей (21.01. — 19.02.) Распусціш грошы і не будзеш лічыцца з думкай іншых. Твая хата будзе як гасцініца — не злуйся. Незычлівыя табе асобы схочуць выклікаць канфлікт.

Рыбы (20.02. — 20.03.) Пад уплывам апазіцыі Плутона да планетоіда Палады (26 — 29.08.) можаш страціць арыентацыю, што для цябе карыснае. У фінансах — застой. Будзеш адчуваць сябе моцным, здаровым і шчаслівым. Будзеш сапраўды фізічна здаровы ды моцны. Чакаюць цябе поспехі.

Агата Арлянская

Шыфраграма

Літары адгаданых слоў, перанесеныя згодна з іх парадкавымі нумарамі ў клеткі роспісу, складуць рашэнне — афарызм Элеанор Рузвельт.

1. наддунайскі горад на поўначы ад Будапешта = 30 _ 7 _ 4 _;
2. не ноч = 1 _ 2 _ 3 _ 13 _ 12 _;
3. тонкі слой ледзяных крышталяў, які ўтвараецца дзякуючы выпарэнням на ахалоджанай паверхні = 5 _ 36 _ 37 _ 15 _;
4. кіславатая студзяністая вадкая страва, напр. з аўса = 24 _ 40 _ 16 _ 14 _ 26 _ 35 _;
5. група спартыўных каманд парытэтных па майстэрству, якія спаборнічаюць паміж сабой = 17 _ 27 _ 28 _ 29 _;
6. яно без дабра не бывае = 11 _ 10 _ 19 _ 25 _;
7. чыгуначная або трамвайная каляя, лінія = 9 _ 18 _ 22 _ 23 _;

1	2	3	4	5	6	7	8	9	10
11	12	13	14	15	16	17	18	19	20
21	22	23	24	25	26	27	28	29	30
31	32	33	34	35	36	37	38	39	40
41									

Адгаданка

8. в'етнамская сталіца = 41 _ 20 _ 6 _ 31 _ 8 _;
9. расійскі або балгарскі ўладар = 34 _ 33 _ 32 _;
10. здраднік, прадажнік = 21 _ 38 _ 39 _; **(ш)**

Падказка: Вац — венгерскі горад.

Сярод чытачоў, якія на працягу месяца дашлюць у рэдакцыю правільныя рашэнні, будуць разыграны кніжныя ўзнагароды.

Адказ на адгаданку з 28 нумара

Бежанства, Вена, вон, дуга, муж, пот, рыза, сын, туман, чын, шына, янычар, ярына.

Рашэнне: **Не гавару, што жанчыны разумныя, яны створаны на падабенства мужчын.**

Кніжныя ўзнагароды высылаем **Яўгену Бялькевічу** з Чыжоў і **Мікалаю Лук'янюку** з Бялкоў.

ISSN 0546-1960